
Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ



наша слова



Газета выходзіць з сакавіка 1990 года   № 48 (536)   5 СНЕЖНЯ 2001 г.

Гаспадарчы суд падказвае: "Бараніце "Пагоню"

ВЫШЭЙШЫ ГАСПАДАРЧЫ СУД РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



ВЫСШИЙ ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

220050, г. Мінск, вул. Валадарскага, 8 Тэл./факс: (017) 227-16-41, (0172) 27-40-09

220050, г. Минск, ул. Володарского, 8 Тел./факс (017) 227-16-41, (0172) 27-40-09

Supreme Economic Court of Republic of Belarus

"26" 11 2001 г.
№ 01-10/767

Грамадскаму аб'яднанню "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны"

Вышэйшы Гаспадарчы Суд Рэспублікі Беларусь, разгледзеўшы Ваш зварот, паведамляе.

У адпавведнасці з артыкулам 204 Гаспадарчага працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь са скаргай у парадку нагляду маюць права звярнуцца бакі і іншыя асобы, якія ўдзельнічалі ў справе, а таксама асобы, чые правы і інтарэсы, якія ахоўваюцца законам, парушаны вынесеным па справе судовым актам.

Пры падачы скаргі ў парадку нагляду неабходна кіравацца Гаспадарчым працэсуальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

Адносна Вашай ацэнкі прынятага судовага акта, тлумачым, што гаспадарчы суд прымае рашэнне толькі на тых доказах, якія былі даследаваны ў пасяджэнні.

Намеснік Старшыні
Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь   Я. А.Смірноў.

Такі вось адказ атрымала ТБМ на зварот, накіраваны ў Вышэйшы Гаспадарчы Суд Рэспублікі Беларусь з нагоды закрыцця беларускамоўнай газеты "Пагоня". Фармальна яго можна чытаць: "Не лезьце не ў свае справы". Але на тое і сядзяць у гаспадарчым судзе юрысты вышэйшай катэгорыі, на тое і пішуць яны дакладна, каб не чытаць напісанае фармальна, а чытаць літаральна. Літаральна ж напісана, што скаргі могуць падаваць асобы, чые правы і інтарэсы парушаны вынесеным па справе судовым актам.

Чые ж правы і ўнтарэсы парушаны закрыццём "Пагоні"?

Парушаны інтарэсы ТБМ, якое змагаецца за беларусізацыю СМІ, закрыта адна з чатырох ці пяці беларускамоўных недзяржаўных газет. ТБМ звярнулася да суда.

Парушаны правы падпісчыкаў. Але дзе тут масавыя звароты і тысячы лістоў?

Парушаны правы кожнага грамадзяніна на атрыманне інфармацыі, бо закрыта рэспубліканская газета. А тут дзе тысячы лістоў?

Як відно з адказу, Гаспадарчы суд чакае гэтых лістоў. Але ці напісалі або ці напішуць іх талерантныя беларусы?

9 снежня - 110 гадоў з дня нараджэння Максіма Багдановіча



Запрашаем на імпрэзу

Цэнтральная бібліятэка імя Янкі Купалы разам з Менскай гарадской арганізацыяй "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" ладзяць святочную імпрэзу з нагоды 110-х угодкаў з дня народзінаў Максіма Багдановіча 8 снежня а 16 гадзіне ў памяшканні Цэнтральнай бібліятэкі імя Янкі Купалы (вул. В. Харужай, 16). Бяруць удзел паэты, барды і музыканты. Запрашаюцца настаўнікі, а таксама навучэнцы краязнаўчых гурткоў, а яшчэ —усе ахвотныя.

Менская гарадская Рада ТБМ.

Дарагія сябры!

9 снежня 2001 года ў Менскім палацы дзяцей і моладзі (Старавіленскі тракт, 41) адбудзецца літаратурна-музычная вечарына "Ты вышэй ад усіх, Страцім...", прысвечаная 110-й гадавіне з Дня народзін Максіма Багдановіча. У імпрэзе бяруць удзел: А. Вярцінскі, С. Панізнік, М. Скобла, Л. Галубовіч, А. Камоцік, Э. Акулін, А. Галіч і іншыя вядомыя паэты і барды.

Пачатак вечарыны – а 16-ай гадзіне. Уваход вольны.

Ушануем самага маладога класіка беларускай літаратуры!

Матэрыялы, прысвечаныя Максіму Багдановічу, чытайце на старонках 6, 7 і 12.

АБВЕСТКА

Чарговае паседжанне Рэспубліканскай Рады ТБМ адбудзецца 16 снежня 2001 года ў памяшканні Дольнай залы Чырвонага касцёла, што на плошчы Незалежнасці ў Менску.

Пачатак працы ў 11 гадзін.

Парадак дня:
1. Справаздача аб дзейнасці ТБМ у 2001 годзе.
2. Абмеркаванне і зацвярджэнне плана работы ТБМ на 2002 год.
3. Аб працы над праектам "Стратэгія развіцця беларускай мовы ў XXI стагоддзі".
4. Аб памеры і чарговасці збірання сяброўскіх складак.
5. Аб зменах у складзе Сакратарыяту ТБМ.
6. Рознае.



№ 48 (536) 5 СНЕЖНЯ 2001 г. Наша слова

Павел Сцяцко

Адраджэнне і ўдасканаленне нацыянальнай беларускай мовы і адлюстраваннне гэтага працэсу ў школьных падручніках

Беларускае нацыянальна-культурнае адраджэнне (магутны ўздым якога здзяйсняўся напрыканцы 80-х – першай палове 90-х гадоў XX стагоддзя) не можа быць спыненае. Яно працягваецца, хоць і запаволеным тэмпам. Аднаўляюцца моўныя нормы, якія адпавядаюць структурна-сістэмным заканамернасцям нацыянальнай беларускай мовы. Пра гэта яскрава сведчыць нацыянальны беларускі друк – часопісы "Роднае слова", "Полымя", штотыднёвік "Наша слова" ды іншыя выданні. Гэта пацвярджаюць і школьныя падручнікі і навучальныя дапаможнікі, выдадзеныя ў 2000-2001 гадах. Да прыкладу, кнігі для 7 класа агульнаадукацыйнай школы па беларукай мове, літаратуры і гісторыі Беларусі.

У кнізе "Беларуская мова" (Падручнік для 7 класа агульнаадукацыйнай школы з рускай мовай навучання. 3-е выданне. Мінск, НМЦэнтр, 2001, аўтары: Г.М. Малажай, З. М. Заіка, Н. М. Чалюк) у § 1 "Мова – грамадская з'ява" сцвярджаецца: "Вярнуліся ў актыўнае ўжыванне словы ***святар, спадар, спадарства, высілкі, наступства, гасцёўня, мытня, стасунак***, ...перастала ўжывацца штучнае для беларускай мовы слова ***акцябронак***" (С.4).

У кнізе замест неўласцівага беларускай мове пазычання ***субяседнік*** (яно матывуецца ўтваральным словам ***бяседа*** *'застолле', 'выпіўка'* і даслоўна значыць ***'сузастольнік', 'субанкетнік', 'субаляваннік'*** ці гутарковае ***'сабутэльнік'***) бачым адмысловае беларускае ***суразмоўца***. ("Пра гэта можна будзе сказаць пасля таго, як суразмоўца выкажа сваю пазіцыю". (С.8). У параграфе "Этыка маўлення. Асноўныя этычныя нормы" падаюцца свае, беларускія словы і словаспалучэнні: "Дабранач!" (а не былое "Спакойнай ночы"), "Шчаслівай дарогі" (а не калька "У добры шлях", "Смачна есці" (а не "Прыемнага апетыту") ды іншыя.

Шмат тут і іншых адмысловых беларускіх лексічных адзінак на месцы былых агульнасаюзных стандартаў: ***славуты*** ("вядомы"), ***летнік*** ("піянерлагер", "дача"), ***выстава, прымірэнчы*** ("прымірымы"), ***людская супольнасць, тыя самыя галосныя*** ("адны і тыя ж").

Аўтары нідзе не выкарыстоўваюць штучных для беларускай мовы дзеяслоўных формаў з націскным гукам ***а*** ў складзе перад суфіксам ***-ва-***. На с.44 падаецца само правіла: "У прыставачных дзеясловах, калі націск прыпадае на склад перад суфіксам ***-ва-***, захоўваецца ці аднаўляецца націскное ***о***: ***падскочыць – падскокваць, адпрасіцца – адрошвацца*** (просьба), ***расслаіцца – расслойвацца*** (слой)". Таму замест штучнага ***"заканчваецца"*** (параўн. натуральнае закончыць) бачым ***канчаецца*** (дзеясловы ***канчаюцца*** на ***–ваю***. (с.44).

На с. 42 фармулюецца адмысловае правіла скланення асабовых назоўнікаў: "Назоўнікі 2-га скланення, якія абазначаюць асобу чалавека, імёны і прозвішчы людзей, у месным склоне маюць канчатак -- ***(-ю)***: пры сыну, Алегу Несцяровічу, Андрэю Кавалю, аб госцю, герою". Аўтары паказваюць заканамернасць такіх словаформаў, як ***моваў, формаў, пры Кузьму, істотаў***.

Скрозь выкарыстоўваецца ў падручніку адмысловая беларуская сінтаксічная канструкцыя "па+ М. Скл. назоўніка (і залежнага ад яго слова)": "Мы ж пазнаём адзін аднаго не толькі па голасе, але і па адным вымаўленым слове" (С.5).

Падручнік для 7 класа агульнаадукацыйнай школы з беларускай і рускай мовамі навучання "Беларуская літаратура" (2-е выданне. Мн.: Універсітэцкае, 2001 г.; аўтары: Лазарук М.А., Русілка В.І., Слесарава І.М.) падае імя аўтара кнігі ў адмысловай беларускай форме Лазарук Міхась Арсеневіч (а не ранейшае ўсесаюзнае "Міхаіл").

І ў гэтым падручніку таксама шмат нацыянальна-беларускіх словаў і формаў на месцы былых усесаюзных (расейскіх): ***водгук на верш*** (не *водзыў*), ***павольная плынь аповеду***, ***аўтарскі аповед*** (не *расказ*), ***складаныя па сэнсе словы*** (не *па сэнсу*), ***адрозніваюцца па змесце, не дамо абсмяяць*** (а не *дадзім)*, ***дабрыня, распавядае пра сваіх герояў, дачыненні да паэзіі, выснова, ягоныя продкі, іхнімі вачыма*** (а не *яго, іх*), ***з нагоды*** (не *з выпадку*), ***трапныя метафары патрабуюць вылучэння*** (не *выдзялення*), ***блізкім да таго кірунку*** (не *напрамку*), ***сталыя эпітэты*** (не *пастаянныя*), ***нагадаюць*** ды шмат іншых.

Прыемна ўражваюць і новыя напісанні слоў, якія адпавядаюць беларускім арфаграфічным (і арфаэпічным) нормам: ***Рамэа, Уільям Шэкспір*** (С.112).

Навучальны дапаможнік П.А. Лойкі "Гісторыя Беларусі ХУІ – ХУІІІ стст." (Нар.асвета. 2000) таксама мае шмат адраджэнцкіх моўных адметнасцяў. Нагадаем найбольш выразныя з іх: калоны грэцкага стылю (С.19), "Глінскі становіца першым дарадцам вялікага князя" (а не саветнікам), супраціўнік, постаці гісторыі, вершнікі, узялі ў аблогу, княства стала іх супольнай дзяржавай, узнавілі перамовы, міжнародныя стасункі, замірэнне, часы дамінавання, найбуйнейшыя ў дзяржаве землеўласнікі (С.76), сяляне-ўцекачы (не бежанцы), беларуска-польскае памежжа (не пагранічча), служкі Хрыста (не служыцелі), "Паступова зачыняліся (не закрываліся) друкарні і школы". "Рысай беларусаў было прытрымліванне (не захаванне) сваіх традыцы" (С.204). "Забранне ў палон людзей" (С.131). "Збор – пратэстанцкі храм" (С.210; параўн. у слоўніках: Сабор – руск. собор).

Такім чынам, прааналізаваныя школьныя падручнікі сведчаць пра трываласць працэсу адраджэння і далейшага ўдасканалення нацыянальнай мовы беларускага народу ў адпаведнасці з яе структурна-сістэмнымі заканамернасцямі.

З жывой народнай крыніцы

Слова *баба* і вытворныя ад яго найменні ў народнай мове

Роля бабы, яе месца і значэнне ў штодзённым жыцці беларусаў досыць разнастайныя і важныя. У традыцыйным этнакультурным аспекце баба не проста *'матчына або бацькава маці', 'старая жанчына', 'замужняя жанчына', 'жонка', 'жанчына наогул',* г.зн. элемент сваяцка-роднасных стасункаў, але і *'жанчына, якая прымала роды'*, а таксама *'знахарка, шаптуха'*.

У агульным нейтральным значэнні *'матчына або бацькава маці'* ў беларускай дыялектнай мове ўжываюцца ў асноўным тэрміны ***баба*** і ***бабка*** (яны, дарэчы, фіксуюцца і нарматыўнымі слоўнікамі).

Разам з тым у беларускіх гаворках поруч з агульнымі нейтральнымі назвамі ***баба, бабка*** ўжываецца і значная колькасць розных іх ацэнкавых формаў, што адрозніваецца пераважна толькі марфалагічна, а часам маюць і пэўныя новыя семантычныя адценні. Найбольш пашыраны на Беларусі памяншальна-ласкальныя формы ***бабу'ля, бабль'ка, бабачка*** (фанет. ***бабочка, бабычка***). Значна радзей ужываюцца формы ***бабонька, бабу'ня, бубу'нька, бабу'ся, бабу'січка, бабця*** (фанет. ***бапця***). Кожная з іх мае абмежаванне выкарыстання ў тым ці іншым рэгіёне Беларусі.

Ад тэрміна ***баба*** ў беларускай дыялектнай мове ўтварылася пэўная колькасць абражальных (павелічальных, фамільярных і г.д.) формаў: ***бабіна, бабзно, бабізна, бабшчэ, бабы'ско, бабёнка, бабушкера, бабу'ха***. Часцей за ўсё іх выкарыстанне абумоўлена неабходнасцю падкрэсліць розныя фізічныя і разумовыя заганы, як правіла, немаладой, у гадах, жанчыны.

Зазначым, што ў беларускіх гаворках ад тэрмінаў ***баба, бабка*** існуе некалькі вытворных з розным лексічным значэннем. Так, адзінокую беззямельную жанчыну, якая часта мае толькі хату, на Беларусі называюць ***бабы'лка, бабы'лька, бабы'ліха***. А дзяўчынку, якую прымала бабка-павітуха, на Берасцейшчыне называюць ***бабычка***. Ужыванне слова ***бабы'лка*** ў сучаснай беларускай літаратурнай мове абмежавана толькі размоўным стылем.

З мэтаю паказаць багацце і разнастайнасць найменняў, якія выкарыстоўваюцца на Беларусі для называння ***бабы*** і быў складзены наступны слоўнічак:

БАБА, ж. 1. Матчына або бацькава маці. Двору нікога німа: бацька й маці паехалі ў Амсціслаў, толькі адна баба зысталысь (в. Большае Пацкава Мсціслаўскага р-на); Бабу, я не буду рваць кветкі (в. Новікі Гарадзенскага р-на).

2. Старая жанчына. Іна баба ўжу старыя: двух мужукоў піряжыла (в. Гаўрыленка Бялынкавіцкага р-на); Вона ж баба проціў его, а не жонка (в. М. Малешава Жыткавіцкага р-на).

3. Замужняя жанчына. Ета ні дзеўкі, ета – бабы, толькі ў іх мужукоў нет: з вайны ні папрыходзілі, ні вярнуліcь (в. Крывалесы Шумяцкага р-на); У "Прамені" (назва раённай газеты) ест апавяданьне пра нашу вёску, здымкі. Многа здымкаў. На здымках бабы, многа іх там, усе замужнія, дзевушак тут німа (в. Савоні Стаўпецкага р-на).

4. Жонка. Браты абодвы на вайне, а бабы іх самі і пашуць і сеюць (в. Арцёмаўка Мілаславіцкага р-на); Моя баба з молодых год мене вувела, а ў старые не ўвела (в. Луткі Столінскага р-на); Калі маладая, то жонка, тады – баба, а як пастарэя, то старая (в. Ігрушка Крупскага р-на); Іці працепліць печ, а то баба замерзніць (в. Магуны Пастаўскага р-на).

5. Жанчына наогул. Зьвяжысь з бабамі – сам ні рад будзеш (в. Фядотава Буда Мілаславіцкага р-на); Дзеўкой на ўсю вуліцу, а бабой на ўсю печ (прымаўка) (в. Запясочча Жыткавіцкага р-на); Тут у нас баба адна памерла за тыдзень перад вашым прыездам. Нешта зрабіласё, спаражывало ўсю, мову атняло бабі – й к абеду памылі ўжо (в. Савоні Стаўпецкага р-на); Бабаў многа ідуць з работы (в. Ністанішкі Смаргонскага р-на).

6. Жанчына, якая прымала роды. Ікая я табе баба, ці я ў цябе дзяцей бабіла? (в. Галічы Мілаславіцкага р-на); Його баба була за бубу у одного мужыка, а я за кума (в.Чэнічы Жыткавіцкага р-на); Даўней баба прымала дзяцёнка (в. Ракаўская Швянчонскага р-на).

^. ***Баба пупорэ'зна, баба-пупорэ'зніца – павітуха***. Бабу пупорэзну брали па свойству (в. М. Малешава Жыткавіцкага р-на); Колісь жонкі ражалі дома, пуп резалаа баба-пупорезніца, а цяпер у Турові у больніцы рожають (в. Пагост Жыткавіцкага р-на). Баба соломенна – варажбітка на саломінках (в. В. Малешава Столінскага р-на). Баба-гром – мажная жанчына (в. М. Малешава Жыткавіцкага р-на). Баба-спірт – рухавая, энергічная жанчына (в. Сямігосцічы Столінскага р-на). Баба-дурнеба – зневажальнае да старой жанчыны. От така я баба-дурнеба! (в. М. Малешава Жыткавіцкага р-на).

БАБАЧКА (бабочка), ж. Памянш.-ласк. да ***бабка*** 'матчына або бацькава маці'. – Бабка, бабачка, падзем пагуляім на рэчку, - і як прыстане, як прыстане – мушу ісьці (в. Бытча Барысаўскага р-на); Ох, бабочко, ці ето я, не я к тобе ў госценькі пріехала, шо ты вочкі закрыла да на мене гледзець не хочэш! (з пахавальных галашэнняў) (в. Пагост Жыткавіцкага р-на).

БАБЁНКА, ж. зневаж. жанчына. Нейкая бабёнка да сына была прыстаўшы, а яны запрасцілі яму жаніцца (в. Ахрэмаўцы Браслаўскага р-на).

БАБЗНО, н. зневаж. нязграбная жанчына. Бабзно – така грузна баба, ідзе, свое цело не несе (в. М. Малешава Жыткавіцкага р-на).

БАБІЗНА, ж. павел. Высакарослая жанчына. Ну бабізна твая жонка! (в. М. Малешава Жыткавіцкага р-на).

БАБІНА, ж. павел. Жанчына. Адна бабіна робіць, а мужыкі ў бальніцы (в. Мсцібава Ваўкавыскага р-на).

БАБІЦА, ж. старая жанчына. От, седзіць у хаці, бі бабіца старая (в. В. Малешава Столінскага р-на).

БАБКА (бапка), ж. 1. Тое, што і баба (у 1, 2, 3, 4 і 5 знач.). Добрэ бабцы і ў шапцы, а дзядку ў платку (прымаўка) (в. Сямурадцы Жыткавіцкага р-на); Бапку, не рухайцеся! Я сама прынясу вадэ (в.Новікі Гродзенскага р-на).

2. Жанчына, якая прымала роды. Бапка прымала дзіця ад радзіхі (в. Старыя Трокі Тракайскага р-на); Бапка бабіла дзіця (в. Малахоўцы Баранавіцкага р-на); Раньше бабкі роды прынімалі (в. Магуны Пастаўскага р-на).

^ ***Бабка-прыродніца***, бабка-павіту'ха.

3. Знахарка, шаптуха. Радзіўсё хлопчык, слабенькі радзіўсё, а гэто ж ні цяпер, што дахтарэ... Іто я памучылася, па бапках возячы, пака ён трохо акрэп (в. Падзерычы Стаўпецкага р-на).

БАБОНЬКА, ж. Тое, што і бабуля. Ох, бабонько, ох, хорошэ! (в. Запясочча Жыткавіцкага р-на).

БАБУ'ЛЬКА, ж. памянш. – ласк. Да баба (у 1, 2 знач.). Тут бабулька старэнька жыве (в. Альхоўка Наваградскага р-на).

БАБУ'ЛЯ, ж. 1. Ласк. да ***баба*** (у 1 і 2 знач.). Бабуля, дзе мае каплі ад вачэй? (в. Вецярэвічы Пухавіцкага р-на), Мая бабуля хадзіла на прыгон (в. Ахрэмаўцы Браслаўскага р-на).

2. Знахарка, шаптуха. Дак я рас прышла (а ў нас натта было многа дзяцей), дык эта бабуля мне як наклала яек, дак я дамоў ужэ й ні прынесла (в. Залазоўе Вілейскага р-на).

БАБУ'НЬКА, ж. Тое, што і бабулька. Дзевятнаццаць гадоў як бабунька памерла, гадоў дзевяноста мела (в. Жылі Іўеўскага р-на); параўн. польск. babunia 'тж'.

БАБУ'НЯ, ж. Тое, што і бабуля. Бабуня Камароўская, ідзеця, я з вамі рашчытаюсё, грошы аддам (в. Савоні Стаўпецкага р-на).

БАБУ'СІЧКА, ж. ласк. ***бабка, баба***. Бабусічка, сядзі ты ўжо, я табе падам, сядзі! (в. Селішча Чэрыкаўскага р-на).

БАБУ'СЯ, ж. Тое, што і ***бабуля***. Ёсьць у мяне бабуся мыя родныя іна мяне жалеіць (в. Арцёмаўка Мілаславіцкага р-на).

БАБУ'ТА, ж. Баба, старая кабета. Пачэпяць етага ката (булачку з хлебнага цеста) на поясе. Тады сабіраюцца дзеці ў тую хату, тады скубуць таго ката. А баба ўжо, бабута, стаіць іс подмаскаю. Катора дзіця сьмялейша, дык скубяне за лапу ці за хвост, а бабута подмаскаю яму, подмаскаю. Во даўней якія забавы былі (в. Дрычын Пухавіцкага р-на).

БАБУ'ХА, ж. зневаж. Някемлівая старая жанчына. Эт, старыя бабуха! (в. Пушкова Касцюковіцкага р-на).

БАБУШКЕРА, ж. зневаж. старая жанчына. Пойду погледжу, куды пошла гэта бабушкера (в. Сцераблічы Столінскага р-на).

БАБЦЯ (бапця), ж. Тое, што і ***бабуля***. Бабця завяжыць касьнік за пасму валасоў і выправіць у школу, уплётаў ніколі не ўпляце (в. Забрэжжа Валожынскага р-на);

БАБЧЫ'ХА, ж. 1. Бабка-знахарка, што лечыць зёлкамі. Бабчы'ха ета ўжу дужа стара і ўсі сваі зыгаворі забыла, яе ўжу ніхто ні завець к сабе (в. Арцёмаўка Мілаславіцкага р-на).

2. Адзінокая беззямельная жанчына, што жыве ў чужых людзей. Кызалі, у етый бабчы'хі нейдзі дычка ёсьць – ніхай бы іна ехыла к дачке (в. Лядзішча Мілаславіцкага р-на).

БАБШЧЭ, ж. павел. дужая высокая жанчына. Я паметаю, як была дзіевчынкаю, а тэпэр такая бабшчэ (в. Курашэва Чыжэўскай гміны (ПНР)); параўн. літ bobse 'старая'.

БАБЫЛІХА, ж. устар. бедная самотная жанчына. Бабыль нічога ні маіць і бабыліха тожа (в. Мярэцкія Глыбоцкага р-на).


БАБЫ'ЛКА, ж. Тое, што і бабыліха. У той бабылкі ні каровы, ні свіней – нічога няма (в. Рудня Астравітая Чэрвенскага р-на).

БАБЫ'ЛЬКА, ж. бабылка, адзінокая беззямельная жанчына, часта мае толькі хату. У Мар'і-бабылькі зьбіраецца вічарінка – скымарох будзіць (в. Міцькаўшчына Мсціслаўскага р-на).

БАБЫ'СКО, ж. павел. тое, што і ***бабшчэ***. Вона – здоровэнна бабыско (в. Дзмітравічы Камянецкага р-на).

БАБЫЧКА, ж. памянш. – ласк. да ***баба, 'жонка'***. У яго малінькія жонка, а тыкая бабычка круцінькая (в. Арцёмаўка Мілаславіцкага р-на).

Ірына Суцько, аспірантка.



Міністэрства юстыцыі амаль беларускамоўнае

Пасля сфармавання новага ўраду Рэспублікі Беларусь ад імя ТБМ былі накіраваныя віншаванні ўсім міністрам і некаторым намеснікам наступнага зместу:

"Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны віншуе вас з прызначэннем на вельмі высокую і адказную пасаду ў гэты нялёгкі і пераломны час для нашай Бацькаўшчыны.

Спадзяёмся, што Вы зробіце ўсё магчымае для надання беларускай мове, мове тытульнай нацыі нашай краіны, рэальнага статусу дзяржаўнай беларускай мовы.

ТБМ таксама хацела б даведацца, як Ваша шаноўнае ведамства збіраецца выконваць перадвыбарчую праграму А.Р. Лукашэнкі, дзе падкрэслівалася неабходнасць усталявання рэальнай роўнасці дзвюх дзяржаўных моў. У сувязі з гэтым просім адказаць на наступныя пытанні:

- на якой мове вядзецца справаводства ў Вашай установе?
- на якой мове праводзяца калегіі і працоўныя пасяджэнні?"

Ад Міністэрства юстыцыі паступіў грунтоўны адказ, які мы прапануем чытачам.

2.11.2001 г. № 04-16/12537

Грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13

Аб статусе дзяржаўнай беларускай мовы ў Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь

Паважаны Алег Трусаў!

Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь у адказ на Вашы пытанні паведамляе наступнае.

У адпаведнасці з артыкулам 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь дзяржаўнымі мовамі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца беларуская і руская мовы.

З 1 верасня 1993 года справаводства, перапіска з Адміністрацыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, з Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, з рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, з арганізацыямі, у тым ліку з грамадскімі аб'яднаннямі ў Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь вядзецца на беларускай і рускай мовах. Адказы на заявы, скаргі грамадзян афармляюцца на беларускай і рускай мовах.

Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь распрацоўвае праекты і дае заключэнні аб праектах заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь і пастаноў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь таксама на беларускай альбо рускай мовах. У прыватнасці, у адпаведнасці з Дакладной запіскай Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь ад 5 жніўня 1999 года № 12/59 у мэтах рэалізацыі артыкула 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і забяспячэння роўнасці дзяржаўных моў, **толькі на беларускай мове** рыхтуюцца праекты пастаноў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь па наступных пытаннях:

зацвярджэнне складу калегій міністэрстваў, іншых рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, а таксама складу розных камісій, саветаў, дэлегацый;

узнагароджанне Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь;

увекавечанне памяці выдатных дзеячоў, аказанне грашовай дапамогі;

правядзенне перагавораў па праектам міжнародных пагадненняў (дагавораў, Канвенцый); упаўнаважанне на вядзенне перагавораў, удзел у розных пасяджэннях, заключэнне і падпісанне пагадненняў (дагавораў, Канвенцый, пратаколаў) аб супрацоўніцтве па розных пытаннях;

выдзяленне міністэрствам, іншым органам дзяржаўнага кіравання, аблвыканкамам, а таксама асобным гарадам і раенам грашовых сродкаў;

выдзяленне аб'яднанням, прадпрыемствам і арганізацыям, калгасам і саўгасам фінансавай дапамогі, бюджэтных пазык, прадаўжэнне тэрміну іх пагашэння і вызваленне ад выплаты пені;

перадача права кіравання маёмасцю (у тым ліку перадача Мінабароны суб'ектам гаспадарання будынкаў, збудаванняў, тэхнічных сродкаў);

кадравыя пытанні.

Праваўстаноўчыя дакументы зарэгістраваных палітычных партый, прафсаюзаў, іншых грамадскіх аб'яднанняў афармляюцца на беларускай мове. Па жаданню кіруючых органаў усе рэгістрацыйныя матэрыялы грамадскіх аб'яднанняў афармляюцца толькі на беларускай мове. Прыём наведвальнікаў і гутарка з імі, па жаданню, таксама вядзецца на беларускай мове.

Увогуле, у Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь рэальна дзейнічае статус дзяржаўнай беларускай мовы ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь".

Міністр В. Р. Галаванаў.

"26" кастрычніка 2001 г.

Кіраўніку Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь У. Р. Латыпаву

Паважаны Урал Рамдракавіч!

Кіраўніцтва ТБМ удзячна Вам за ўвагу да нашага ліста пра лёс Светлагорскага гуманітарнага ліцэя. Аднак адказ, які па Вашаму загаду накіравала нам Міністэрства адукацыі, задаволіць нас не можа (ліст №20-06/233 ад 15.10. 2001 падпісана сп. Дылянам Г.Д.). З гэтага адказу вынікае, што ўвесь час філіял Нацыянальнага гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа ў Светлагорску існаваў "з парушэннем заканадаўства". Аднак гэта не перашкодзіла яму стаць адной з самых прэстыжных навучальных установ не толькі ў Светлагорску, але і на Гомельшчыне.

Цікава, куды ўвесь гэты час глядзела Міністэрства адукацыі Беларусі і, у тым ліку, намеснік міністра сп. Г. Д. Дылян? Чаму адказныя чыноўнікі гэтага ведамства не дапамаглі гарадскім уладам Светлагорска захаваць ліцэй, як асяродак нешматлікай беларускамоўнай адукацыі на Гомельшчыне?

У выніку справа зроблена, ліцэй зачынены, а яго навучэнцаў турбуе мясцовая пракуратура.

Шаноўны Урал Рамдракавіч! Ведаючы Вашае становішча стаўленне да развіцця беларускай культуры, просім Вас паспрыяцьператварэнню сярэдняй школы № 1 г. Светлагорска ў гімназію з беларускай мовай навучання, у адпаведнасці з пастановай Міністэрства адукацыі ад 28 жніўня 2001 г., № 48.

Такім чынам апошні беларускамоўны асяродак у Светлагорску будзе захаваны. Гэта, безумоўна, будзе адпавядаць прадвыбарным абяцанням А. Р. Лукашэнкі аб рэальнай роўнасці беларускай і рускай моваў.

З павагай
Старшыня ГА "ТБМ імя Ф. Скарыны" Алег Трусаў.

"15" лістапада 2001 г. № 551

Першаму намесніку Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь Жуку А. І.
9, Савецкая, 220010, Менск.

Паважаны Аляксандр Іванавіч!

Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны віншуе Вас з прызначэннем на вельмі высокую і адказную пасаду ў гэты нялёгкі і пераломны час для нашай Бацькаўшчыны.

Спадзяемся, што Вы зробіце ўсё магчымае для надання беларускай мове, мове тытульнай нацыі нашай краіны, рэальнага статусу дзяржаўнай беларускай мовы.

Як нам стала вядома, у кіраўнічых колах нашай краіны абмяркоўваецца прапанова ТБМ аб адкрыцці ў Беларусі Беларускага нацыянальнага універсітэта. У сувязі з гэтым мы прапануем арганізаваць і правесці "круглы стол" па гэтым пытанні з Вашым непасрэдным удзелам.

З павагай,
Старшыня ГА "ТБМ імя Ф. Скарыны" Алег Трусаў.

Дыялог, які не адбыўся

Напрыканцы лістапада ў Менску адбылася міжнародная канферэнцыя "Менскі форум V. Беларусь: палітыка, эканоміка, міжнародныя стасункі".

Праводзіў канферэнцыю аналітычны цэнтр "Стратэгія" пры ўдзеле КНГ АБСЕ, амбасадаў ЗША і Германіі, фонду Фрыдрыха Эберта і некаторых іншых нямецкіх грамадскіх арганізацый.

На канферэнцыю былі запрошаны прадстаўнікі беларускай улады, кіраўнікі беларускіх партый і рухаў, незалежных грамадскіх арганізацый, прафсаюзаў, вядомыя навукоўцы, палітолагі і эканамісты, журналісты, амбасадары розных краін.

Сярод запрошаных быў і старшыня ТБМ Алег Трусаў. Праца форуму доўжылася тры дні. На форуме былі абмеркаваны ўнутраная палітыка Беларусі пасля прэзідэнцкіх выбараў, знешняя палітыка ў Еўропе і месца Беларусі ў ёй, суадносіны паміж грамадствам і асобай, некаторыя аспекты міжнароднай бяспекі, звязаныя з праявамі міжнароднага тэрарызму.


Сярод прысутных была распаўсюджана справаздача амбасадара Ханса-Георга Віка пад назвам "Беларусь пасля выбараў: вынікі, легітымнасць, назіранне". Паколькі сябры ТБМ прынялі актыўны ўдзел у незалежным назіранні, прывядзём цытату з гэтага дакумента: *3. "Характэрна, што справаздача місіі доўгатэрміновых назіральнікаў Асацыяцыі арганізатараў выбараў краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы таксама ўтрымоўвау крытычныя водгукі... У выніку ўдасканаленняў, дасягнутых у манеры правядзення выбараў пад жорсткім дзяржаўным кантролем,* ***працадура фальсіфікацыі перастала быць кольки-небудзь бачнай..."***

Шмат якія нямецкія палітыкі рабілі рэверансы перад кіраўніцтвам Беларусі і заклікалі яго да паэтапнага дыялогу, нягледзячы на вынікі апошніх прэзідэнцкіх выбараў. Іх прыхільнік, сп. Мікола Статкевіч запэўніў прысутных, што яго партыя возьме актыўны ўдзел у выбарах у т. зв. "саюзны парламент". Аднак, нават такія абяцанкі не дапамаглі і ўлады на канферэнцыю проста не прыйшлі, бо ніякай "дэмакратызацыі" ім не трэба.

Наш карэспандэнт.

Да 110-годдзя Аркадзя Смоліча

Рэспубліканскае дзяржаўнае аб'яднанне вымусціла маркаваны мастацкі канверт да 110-годдзя з дня нараджэння Аркадзя Смоліча, аўтара першага падручніка "Геаграфія Беларусі".



БЕЛАРУСКАЯ АФІША

6 снежня. 19.00. Тэатр Юнага Глядача (Энгельса, 26). Прэм'ера сольнага праекту Зміцера "Тодара" Вайцюшкевіча (КРЫВІ) "Цацачная крама" на вершы паэта Леаніда Дранько-Майсюка. У праграме таксама выкананне песень з супольных музычных праектаў: "Народны альбом", "Святы вечар". "Я нарадзіўся тут".


12 снежня. ДК МТЗ. Юбілейны канцэрт легенды беларускага року "КРАМА – 10 год" з прэзентацыяй новага альбома "Хавайся ў бульбу!". Пачатак 19.00.

13 снежня. ДК МТЗ. Прэзентацыя альбома "Прылітай!" гурта "Нічний портьє" з удзелам гуртоў "Тяни-Толкай", праектаў "Made in Belarus" і "Made in Ukraine". Пачатак 19.00.

25 снежня. ДК МТЗ. "ВОЛЬНЫЯ ТАНЦЫ НА КАЛЯДЫ" з удзелам "Палац", "POSTSCRIPTUM", "Акруга Вольнага Мастацтва" і інш.

Пачатак 19.00.

Сувязь з арганізатарамі: 8-0296-490888, 2118585 (аб.БМА).



№ 48 (536) 5 СНЕЖНЯ 2001 г. наша СЛОВА

Лешак Бэднарчук

АБ ЭТНАГЕНЕЗЕ БЕЛАРУСАЎ

*Гэты артыкул публікаваўся раней у зборніку: **Leszek Bednarczuk. Jezyki Wielkiego Ksiestwa Litewskiego na tle porownawczym. Wilno, 1993.** Зборнік быў выдадзены Польскім універсітэтам у Вільні абмежаваным накладам і прызначаўся, галоўным чынам, для студэнтаў. Па просьбе аўтара, а таксама з улікам навуковай значнасці і актуальнасці, якой артыкул не згубіў і сёння, праца Л. Бэднарчука была перадрукаваная ў беларускім перакладзе і паступіла ў рэдакцыю "Нашага слова".*



Шматгадовая навукова-дыдактычная, арганізацыйная і выдавецкая дзейнасць прафесара А. Абрэмбскай-Яблонскай на ніве беларускай філалогіі з'явілася ў значнай ступені прычынай ажыўлення цікаўнасці да мовы, культуры і мінуўшчыны гэтага, некалі вельмі блізкага нам народа. На міжнародных форумах славістаў беларуская тэматыка пачынае здабываць месца, якое ёй прыстала займаць. Да адной з тых праблем, што ў апошнія часы дыскутуюцца ўсё часцей, належыць праблема этнагенезу беларусаў і звязаная з ёй тэматыка балта-славянскіх кантактаў. Менавіта гэтыя праблемы адлюстроўваюцца ў шматлікіх публікацыях і тэматыцы навуковых канферэнцый. Адна з такіх канферэнцый, якая мела адбыцца 3 – 6 снежня 1973 г. у Менску, знайшла сваё выражэнне ў тэзісах 82 дакладаў па гісторыі, археалогіі, антрапалогіі, этнаграфіі і мовазнаўству?. Некаторыя з іх былі прадстаўлены на дзвюх іншых канферэнцыях, прысвечаных этнагенезу балтаў: у Рызе (1977) і ў Вільні (1981). Праблематыка балта-славянскіх кантактаў часта асвятляецца ў балта-славянскай серыі публікацый Інстытута славяназнаўства і балканістыкі АН СССР. Першым пачаў займацца тэматыкай сувязяў паміж народамі і мовамі Ўсходняй Еўропы часопіс "Balticoslavica", заснаваны ў 1933 г. у Вільні пры ўдзеле праф. У. Антаневіча. Традыцыі гэтага часопіса працягвае наш зборнік, дзе друкуюцца матэрыялы канферэнцый ў Беластоку (1961) і Белавежы (1973).

Мой артыкул мае на мэце сціслае падсумаванне і дапаўненне папярэдніх даследванняў па этнагенезу беларусаў шляхам вызначэння паслядоўных этнамоўных слаёў на заселеных імі тэрыторыях: (I) угра-фінскага, (II) балтыйскага, (III) скандынаўскага, (IУ) польскага, а пасля дапаўнення (У) этнакультурных даных абмеркаваннне (УІ) уплыву дагістарычных адносін на этнагенез беларусаў. Зоны найважнейшых арэалаў і іх граніцы ілюструе этналінгвістычная карта Беларусі.

1. ПРАБЛЕМА УГРА-ФІНСКАГА СУБСТРАТУ Ў БЕЛАРУСІ.

Самая старая з археалагічных культур Беларусі, якая паддаецца інтэрпрэтацыі, – гэта ямкава-грабеньчатая кераміка, паходжанне якой (па меншай меры, на гэтай тэрыторыі) прыпісываецца угра-фінскім народам. Сярод іх тэрытарыяльна найбольш блізкія - заходнеугра-фінскія мовы, а для беларускага Прыдняпроўя – валожская група. На магчымасць існавання угра-фінскага субстрату ў Беларусі ўскосна ўказвае гідранімія сумежных з ёй з усходу зямель Верхняга Паволжжа, з поўначы – наўгародскіх і пскоўскіх зямель і з захаду – Латвіі і Літвы, а таксама інтэнсіўныя балтыйска-заходнефінскія кантакты, якія мелі месца непасрэдна па суседству. Падобным чынам выглядае справа і пры даследаванні найстарэйшых славянска-заходнефінскіх кантактаў, вынікам якіх побач з лексічнымі запазычаннямі могуць быць пэўныя фанетычныя і сінтаксічныя асаблівасці паўночнарускіх і беларускіх гаворак. З угра-фінскім уплывам мы спатыкаемся перш за ўсё ў беларускіх гідронімах, на што звярталі ўвагу яшчэ К. Буга і Я. Развадоўскі, а таксама П. Арумаа. Відавочна ёсць яны таксама на Верхнім Падняпроўі і ў суседняй Літве.

Сярод буйных рэк прыводзяцца назвы **Сожа** (пар. фін. *susi* 'воўк') і **Нёмана** (фін. *niemi* 'мыс'), а заходнефінская **Дзвіна** Vajna-joki некалькі разоў паяўляецца ў гідраніміі Беларусі, таксама ў дублетах **Дзвіна, Дзвіноса/Вейна (Wiejna)**. Варта таксама зазначыць, што магчымая старажытная назва Дзвіны Toupovris (Пталамей, 3,5,1) мае сувязі з заходнефінскімі гідронімамі таксама на тэрыторыі Літвы (Tarande) і Латвіі (Terand).

З іншых назваў, у якіх назіраюцца сляды угра-фінскага паходжання, можна пералічыць наступныя:

Няміга, некалькі гідронімаў у басейне Прыпяці і Дзясны, пар. Таксама **Немега,** прыток ракі Вялікай на Валдаі. Тая ж аснова і ў гідроніме Нёман; фармант –ga часта сустракаецца ва угра-фінскай гідраніміі.

Невель, 1) возера і горад на Віцебшчыне, 2) вёска на рукаве Прыпяці каля Пінска, а таксама некалькі тапонімаў і гідронімаў на Пскоўшчыне і ў Літве (Nevelis). Назва ўтворана ад заходнефінскай асновы (пар. фін. ***neva*** 'балота', рака **Нева**) пры дапамозе балтыйскага суфікса. Сюды ж можна далучыць пашыраную яцвяжскім гідранімічным фармантам ***–da*** назву ракі каля Наваградка – **Неўда**; пар. таксама другую назву вёскі Малая Хмельніца каля Слоніма – **Неўка** (Skorowidz miejscowosci Rzeczypospolitej Polskiej, s.1116).

Свір, 1) возера і гарадок на Віленшчыне, 2) **Свіра** возера на Віцебшчыне, пар. Таксама воз. **Siver** у Латвіі, назву якога Я. Развадоўскі (с.210-213) выводзіць з фінскага siva 'глыбокі', sivari 'глыбіня'.

Валожына, 1) возера і горад **(Валожын)** на Віцебшчыне, 2) возера каля **Неўеля**. Я. Развадоўскі (с.227-230) звязвае з фінскім valkea 'белы', пар. Назвы **Волга**, **Волагда** і г.п.

Менш верагодна з пункту гледжання магчымай балтыйскай ці славянскай этымалогіі угра-фінскае паходжанне назваў:

Іса, рукаў Шчары каля Слоніма, якую К. Буга (I,504) выводзіць з літоўскага дыял. Isas 'кароткі', прус. Insan 'тое ж'. Назва паўтараецца некалькі разоў на Віцебшчыне, Пскоўшчыне і ў Эстоніі, пар. Эст. Іса 'бацька', фін. isa 'тое ж'; паралелі ў значэннях знаходзім у эстонскім Ema-jogi 'рака-маці' (прыток возера Pejpus). (с.98-102) тлумачыць назву на індаеўрапейскай аснове.

Мядзель, назва двух азёр 1) на Віленшчыне каля Нарачы, якое называецца таксама Сасновае (SG, VI, s.238), 2) у верхнім цячэнні Бярэзіны Дняпроўскай. К. Буга (III, с.532) звязвае яе з назвай рэчкі Мяндзеліца каля Дзісны, рэканструючы балтыйскую форму *Mendelas, адкуль беларускае *Медełъ>Miadziel, і супастаўляе з латышскім тапанімам Mendes, які Я. Эндзелін выводзіць з эстонскага ***mand*** 'сасна' (пар. Вышэй другую назву воз. Сасновае). Тады як Тапароў/Трубачоў (с.197) звязваюць яе з літ. ***medis*** 'дрэва', што ідзе насуперак фанетычным асаблівасцям і назве Mendelica.да назваў з суфіксам *-ks-* (некаторыя даследчыкі гавораць пра іх угра-фінскае паходжанне) П. Арумаа дадае гідронімы Корша, Лушка, Нарэкша, Векша са Смаленшчыны, а таксама Карашка з басейна Дзвіны каля Полацка.

Як вынікае з папярэдняга агляду, гідронімы угра-фінскага паходжання раскіданы па ўсёй тэрыторыі Беларусі, галоўным чынам, аднак, на Паазер'і, а таксама ў басейне Дзвіны і Верхняга Дняпра. Большасць з іх паўтараецца на этнічнай заходнефінскай тэрыторыі, на Пскоўшчыне, а некаторыя таксама ў балтыйскіх краінах. На балтыйскае пасрэдніцтва ўказвае іх фанетычная і словаўтваральная структура (фарманты *-a-*, *-el-*), аказваецца, такім чынам, праўдападобнае тое, што славянскія плямёны, прыйшоўшыя сюды ў VI-IX стст. не сутыкаліся з угра-фінскім насельніцтвам непасрэдна.

II. БАЛТЫЙСКІ КАМПАНЕНТ У БЕЛАРУСКАЙ ТАПАНІМІІ І МОВЕ

Удзел балтаў у этнагенезе беларусаў належыць да тых тэм у балтаславістыцы, якія часцей за ўсё абмяркоўваюцца ў апошні час. Яна цесна звязана з праблематыкай прабалта-славянскай еднасці, прарадзімы балтаў і арэальных кантактаў паміж абедзвюма моўнымі групамі. Сувязі паміж балтыйскімі і славянскімі мовамі прыцягваюць увагу вучоных на працягу амаль ста гадоў. Вынікі даследванняў апошніх гадоў падвялі А. Непакупны (1976) і Ю. Лаўчутэ (1980). З пункту гледжання этналінгвістыкі заслугоўваюць увагу наступныя праблемы: (1) аб'ём і характар балтыйскай анамастыкі Беларусі, (2) літоўскія запазычанні ў беларускай мове і гаворках, (3) латышска-беларускія моўныя кантакты, (4) роля заходнебалтыйскіх элементаў, (5) генезіс балтызмаў Палесся, (6) пытанне аб балтыйскай гідраніміі Верхняга Падняпроўя.

1. Аб'ём і характар балтыйскай анамастыкі Беларусі

Балтыйскія элементы прадстаўлены ў беларускай гідраніміі і антрапаніміі на розных абшарах. З прац К. Бугі, Я. Развадоўскага і найноўшых даследаванняў вынікае, што гідронімы балтыйскага паходжання складаюць асноўную частку гідраніміі Беларусі, выходзячы за яе межы. Уласна гаворачы, праблемай з'яўляецца іх этналінгвістычная ідэнтыфікацыя, прынцыпы фанетычнай субстытуцыі і сувязь з асобнымі балтыйскімі арэаламі. Ніводнае з гэтых пытанняў не дачакалася яшчэ ўласцівага адказу, выказваюцца толькі сцверджанні пра тое, што лягчэй за ўсё было б растлумачыць іх пры дапамозе літоўскай мовы.

Найбольшае згушчэнне балтыйскіх тапонімаў і тапанімічных фармантаў мы назіраем на літоўскім пагранічны і на поўначы (Полацк, Віцебск). У паўночна-заходнім поясе яны звязваюцца з суседнімі гаворкамі, усходне-аўкштайцкімі і дзукоўскімі. На падставе распаўсюджання суфікса ***–ішкі*** Я. Сафарэвіч вызначыў усходнюю граніцу літоўскай мовы ў XIУ-XУ стст., г.зн. што граніца ўсталявалася, відаць, падчас прыняцця хрысціянства, таму што на тым самым абшары каталіцызм пераважае над праваслаўем, а таксама гэта граніца супадае з указанай В. Галубовічам граніцай літоўскай каланізацыі ў дагістарычныя часы. Гэта лінія праходзіць ад Браслава праз Нарач, Свір, уздоўж Нёманскай Бярэзіны, ад яе вусця па правым беразе Нёмана да Чорнай Ганчы, а далей уздоўж левага берага. На паўднёвым ўсход ад лініі Сафарэвіча асобныя балтыйскія элементы праяўляюцца ва ўсім басейне Дзвіны і Нёмана. Некаторыя з іх аднак, як заўважаюць М. Бірыла і А.Вангас, могуць быць вынікам больш позняй літоўскай каланізацыі з часоў існавання Вялікага княства.

Гэта тычыцца ўласна антрапаніміі, як, напрыклад, у месцы Абольцы каля Віцебска, дзе Я. Ахманскі на падставе дакументаў XIУ-XУ стст. адкрыў вялікую колькасць літоўскіх імён, часткова захаваных (у выглядзе прозвішчаў) і да сённяшняга дня, што пацвердзілі тэрытарыяльныя даследванні А. Непакупнага.

2. Літоўскія запазычанні ў беларускай мове і гаворках.

Лексічныя балтызмы ў беларускіх дыялектах можна паводле В. Мартынава падзяліць на тры тыпы: (1) субстратныя лексемы шырокага распаўсюджання ў паўночнаславянскім арэале; (2) субстратныя лексемы, абмежавана распаўсюджаныя не на сумежных з балтыйскім арэалам тэрыторыях, (3) кантактныя запазычанні. Апошнія, зразумела, найбольш шматлікія і маладыя. Ужо ў першым томе Слоўніка паўночна-заходніх гаворак налічваецца іх каля 400 на 7000 слоўнікавых артыкулаў. Тут ідзе гаворка пра тэрыторыі, што знаходзяцца на поўначы ад лініі Дрыса – Докшыцы – Лагойск – Валожын – Клецк – Івацэвічы – Пружаны – Каменец Літоўскі, г.зн. блізка ад Віленшчыны і Наваградчыны.

Сярод названых В. Урбуцісам беларускіх літуанізмаў, агульнай колькасцю больш за 100, каля адной трэцяй належыць да агульнаўжывальнай лексікі, а адна чацвёртая была ўжо вядома канцылярскай мове Вялікага княства Літоўскага. Шмат якія з іх бытуюць у польскай мове Віленшчыны і сейненска – аўгустоўскіх гаворак. Як заўважае Ю. Лаўчутэ, гэта перш за ўсё назвы мясцовасцяў і расліннага покрыву. Далей ідуць тэрміны земляробства, жывёлагадоўлі, будаўніцтва, рыбалоўства, назвы прылад працы і экспрэсіўная лексіка. Затое літоўскія лексемы ў актах канцылярыі Вялікага княства Літоўскага – гэта перш за ўсё юрыдычныя тэрміны і назвы паняццяў, звязаных з гаспадаркай. Сярод субстратных запазычанняў пераважаюць назвы мясцовасцяў (мікратапанімія) і расліннага покрыву. Даволі распаўсюджаны таксама тэхнічныя тэрміны і назвы прадуктаў харчавання.

(Працяг у наступным нумары.)



СТАРАДАРОЖСКІ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ


Ствараецца зала заходнебеларускага мастацтва

Музей выяўленчага мастацтва (Фонд Анатоля Белага) стварае адмысловую залу заходнебеларускага мастацтва 20-30-х г.г. Кіраўніцтва музея, клуб "Спадчына", Таварыства Беларускай Мовы імя Ф. Скарыны, Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына", "Камітэт ушанавання", а таксама газета "Наша слова" звяртаюцца да ўсіх беларусаў Бацькаўшчыны, Віленскага краю, Беласточчыны, замежжа, у каго перазахоўваюцца творы заходнебеларускіх мастакоў аказаць пасільную дапамогу ў стварэнні такой залы.


Усіх хто падтрымае агульнанацыянальныя намаганні будуць адзначаны і за сваю дабрачыннасць ганараваныя "Камітэтам ушанавання".

Чакаем Вашых прапаноў і садзеяння,


Тэлефануйце Анатолю Беламу тэл. 2-35-66-08 (Менск), альбо 8-292-55-2-53 (Старыя Дарогі).



Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!..



Мову родную хто пазабыў, абсмяяў, загубіў за нішто, каб ён свету не знаў...



Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная...



Любіць Радзіму, шанаваць родную мову, захоўваць спадчыну...

Наша даведка. *У 6-м Томе Энцыклапедыі гісторыі Беларусі змешчаны артыкул пра гэты музей, які мы прыводзім цалкам. У дадатак скажам, што за гэты час экспазіцыйная плошча музея значна павялічылася, яна ўяўляе – 4 двухпавярховыя будынкі, якія ўсе звязаны паміж сабой. У 8-мі залах з экспазіцыйнай плошчай звыш 500 м2 экспануецца звыш 1200 твораў мастацтва, якія разбіты па тэмах: "Гісторыя Беларусі ў мастацкіх вобразах і партрэтах", "Старажытная Беларусь", "Змагарная Беларусь", "Маладая Беларусь", "Любіць радзіму – шанаваць родную мову", "Максім Багдановіч", "Францішак Багушэвіч", а цяпер ствараецца зала мастакоў Заходняй Беларусі і замежжа.*

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі Т.6., кн. 1, Мн.2001 г.

СТАРАДАРОЖСКІ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ. Засн. У 1990, адкрыты 11.11.1999 у г. Старыя Дарогі. Пл. экспазіцыі 150 м2, каля 3 тыс. экспанатаў асн. фонду (2000). Аснову калекцыі складае асабісты збор калекцыянера А. Я. Белага, у т. л. творы мастакоў Г. Вашчанкі, А. Лось, А. Марачкіна, В. Цвіркі, Г. і Я. Ціхановічаў, А. Цыркунова, Л. Шчамялёва, скульптараў С. Вакара, У. Летуна, У. Печкіна, А. Шатэрніка і інш. Сярод экспанатаў каля 120 партрэтаў вядомых бел. асоб, у т. л. Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Ф. Скарыны, М. Гусоўскага, Т. Касцюшкі, С. Буднага, В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Цёткі, Ядвігіна Ш., Я. Лучыны, І. і А. Луцкевічаў, В. Ластоўскага, Я. Лёсіка, К. Каганца, Старога Уласа і інш.; больш за 100 партрэтаў полацкіх князёў, Вял. Князёў і дзярж. дзеячаў ВКЛ (Усяслава Брачыславіча, Віценя, Гедзіміна, Альгерда, Кейстута, Ягайлы, Жыгімонта І Старога, князёў Алелькавічаў, Радзівілаў, Храптовічаў, Л.Сапегі і інш.), намаляваных мастаком А. Крывенкам; 70 палотнаў, прысвечаных паўстанню 1863-64, і партрэты яго кіраўнікоў К. Каліноўскага і В. Урублеўскага; партрэты дзеячоў бел. замежжа М. Забэйды-Суміцкага, С. Карніловіча, З. і Я. Кіпеляў, Б. Кіта, К. Мерляка, А. Шукелойца і інш., сучасных дзеячаў нац. бел. гісторыі, культуры і мастацтва М. І. Ермаловіча, М.М.Улашчыка, У. А. Юхо, А. П. Грыцкевіча і інш. У экспазіцыі партрэт караля Яна III Сабескага, медальён караля Аўгуста III (17 ст.), карцін "Грунвальдская бітва 1410 г.", радаводы князёў Беларусі, графічныя творы мастакоў М. І У. Басалыгаў, Э. Агуновіча, С. Геруса, А. Кашкурэвіча, М. Селешчука і інш. да твораў А. Адамовіча, В. Быкава, М. Гусоўскага, У. Караткевіча, А. Лойкі, І. Гётэ, плакаты бел. мастакоў, вырабы разьбы па дрэве, збор медальернага (каля 600 экз.) і дэкар.-прыкладнога мастацтваў, вышыванкі.

Анатоль Валахановіч.

ПАМЯЦЬ

г. Менск кн. 1


У Менску ў выдавецтве БЕЛТА выйшла 1-я з чатырох кніг гісторыка-дакументальнай кронікі гарадоў і раёнаў Беларусі "Памяць. Мінск".

Першая кніга менскай кронікі ахоплівае перыяд гісторыі горада ад часоў старажытных да сярэдзіны XIX ст (1861 г.). Яна ўключае шматлікія гістарычныя нарысы і артыкулы, напісаныя спецыяльна для гэтага выдання, а таксама архіўныя дакументы, разнастайныя публікацыі з друкаваных крыніц і навуковыя даследванні па гісторыі Менска, даведачныя матэрыялы і інш.

У пошуку, зборы і напісанні матэрыялаў прымалі ўдзел прадстаўнікі грамадскасці Менска, навукоўцы, супрацоўнікі архіваў, бібліятэк, музеяў, пісьменнікі, журналісты, рэдактары.

Найбольш адметным з'яўляецца тое, што стваральнікі кнігі імкнуліся прытрымліваціа прынцыпу плюралізму пры асвятленні падзей гісторыі Менска. Таму ў кроніцы прадстаўлены артыкулы, у якіх выказваюцца розныя, нярэдка супрацьлеглыя погляды.

У гэтым складальнікі працягнулі традыцыі тых творчых калектываў, якія пры складанні падобных кронікаў для іншых гарадоў і раёнаў паставілі прынцыпы навуковасці і праўдзівасці ў аснову працы, напрыклад, такая ж кніга Нясвіжскага раёна, у супрацьвагу тым раёнам, якія дзеля



тога, каб дагадзіць уладзе, гатовы выкрасліць, або "забыць" палову падзей і імёнаў.

Так у спісе даследчыкаў менскай гісторыі знайшлося месца і У. Ігнатоўскаму, і Л. Абэцэдарскаму, і А. Ельскаму, і М. Ермаловічу, і А. Грыцкевічу, і З. Пазняку, і Старшыні ТБМ Алегу Трусаву.

Не прамінулі ў кнізе і аўтараў шэрагу гістарычных мастацкіх кніг У. Арлова, К. Тарасава, В. Чаропку.

Трэба спадзявацца, што і астатнія кнігі менскай "Памяці" будуць вытрыманы ў тым жа духу.

Яраслаў Грынкевіч.



№ 48 (536) 5 СНЕЖНЯ 2001 г. наша СЛОВА

Да 110-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча

МАКСІМ БАГДАНОВІЧ І МУЗЫКА

(Новыя тэхналогіі выкладання творчасці М. Багдановіча)

Выпускнік сучаснай масавай школы павінен не толькі ведаць папярэднюю сусветную культуру, але і валодаць яе галоўнымі нацыянальнымі часткамі. Іншымі словамі, сучасная агульнаадукацыйная школа павінна не толькі даць школьніку трывалыя веды пра сучасную культуру, але і ўжывіць немаўляці "кантэкст этнакультуры да ўзроўню яго этнічнай самасвядомасці", а потым яшчэ развіць здольнасці вучня "да ўзроўня нацыянальнай па форме культурнавытворчай дзейнасці".

А гэта значыць, што побач з вучэбнымі дысцыплінамі, якія развіваюць лагічнае мысленне, павінны ўкараніцца прадметы такой мастацкай адукацыі, якая не толькі развівае другую палову мозгу – тую, якая кіруе вобразным мысленнем, але дапамагае авалодаць галоўнымі часткамі нацыянальнай культуры. Гэта такая адукацыйна-выхаваўчая парадыгма, у якой абавязковымі навучальнымі прадметамі з'яўляюцца тэатральны фальклёр, традыцыйныя рамёствы, спевы, фальклёрны танец, музычны фальклёрны інструмент.

Пад уздзеяннем псіхолага-педагагічнага і грамадска-метадычнага руху, значна павысілася цікавасць да праблемы пошукаў дыдактыка-метадычных падыходаў, сродкаў, новых тэхналогій навучання літаратуры ў пачатковай, базавай і сярэдняй агульнаадукацыйнай школах у цеснай сувязі з прадметамі мастацка-эстэтычнага цыклу.

Паглыбленая ўвага да вывучэння роднай літаратуры, роднай мовы, культуры свайго народа стварае шырокія магчымасці для выхавання асобы з пачуццём нацыянальнай годнасці, гонару за свой край, людзей свайго краю, асобы з тонкай, чулай, спагадлівай душою. А таксама – спрые развіццю творчых задаткаў як настаўніка, так і вучня, нарыхтоўцы апошняга да навучання ў педагагічных ВНУ Рэспублікі Беларусь.

Лепшыя ўзоры творчасці беларускіх пісьменнікаў натхняюць да творчасці кампазітараў, мастакоў і іншых дзеячоў культуры. Дзеці павінны ведаць, што паводле мастацкіх твораў розных жанраў ствараюцца балеты, оперы, на вершы паэтаў напісаны рамансы, песні. У гэтай сувязі трэба адзначыць, што рэкамендацыі, доследы вучоных-педагогаў, вядомых дзеячоў культуры сведчаць аб тым, што вырашыць гэтыя педагагічныя праблемы ў поўнай ступені дапамогуць новыя дыдактыка-метадычныя тэхналогіі, скіраваныя на навучанне роднай літаратуры ў цеснай сувязі з прадметамі мастацка-эстэтычнага цыклу, прычым, калі навучанне і выхаванне будзе спрыяць творчаму пачатку, у сваю чаргу скіраванаму на "фармаванне ў школьнікаў пачуцця прыгожага ў мастацтве і жыцці, выхаванне высокіх эстэтычных густаў".

Глыбіня зместу, пластыка формы, мілагучнасць, сапраўдная музычнасць верша здзіўляюць кожнага, хто знаёміцца з творчасцю вялікага беларускага паэта Максіма Багдановіча. Што ж спрыяла ўзбагачэнню музычнага свету М. Багдановіча? Нагадаем, што ў артыкуле "Забыты шлях" сам паэт зазначае: "... трэба трымацца народнай песні, як сляпы трымаецца плота". Уся музыка для паэта – гэта песня, якая ўслаўляе жыццё, хоць гэта жыццё "вельмі часта і бязлітаснае для людзей". Музычныя схільнасці М. Багдановіча знаходзяць адлюстраванне ў ягонай творчасці: у сваіх лепшых творах паэт пайшоў да поўнага адзінства думкі, пачуцця і музыкі слова, - адзначаюць даследчыкі яго творчасці. Не многім аўтарам удаецца дасягнуць такой празрыстасці, такой чысціні гучання верша, якая адрознівае яго радкі:

Па-над белым пухам вішняў
Быццам сіні аганёк,
Б'ецца, уецца шпаркі, лёгкі
Сінякрылы матылёк.

Музычнасць, песеннасць паэта народжана шэрагам жыццёвых абставін. Пры першым знаёмстве з творамі паэта, настаўнік найперш раскажа школьнікам яго біяграфію.

Нарадзіўся М. Багдановіч у Менску 9 снежня 1891 года. Праз паўгода сям'я пераехала ў Гародню. Максіму было пяць гадоў, калі ад хуткацечных сухотаў памерла маці. Яна мела музычную падрыхтоўку, як таго вымагалі патрабаванні да настаўніцы са спецыяльнай педагагічнай адукацыяй. Маці паэта прыгожа спявала, асабліва быў любы ёй раманс Глінкі "Паўночная зорка". Бацька з сям'ёй пераехаў у Ніжні Ноўгарад. Там жылі дзве цёткі Максіма – Марыя і Магдаліна, сем'і Галаванаў і Гапановічаў. "Цяжка пераацаніць іх ролю ў творчым станаўленні паэта. Тут уладарыла ў нейкай ступені атмасфера беларускага жыцця-быцця. Вядома, толькі цёткі лічылі сябе беларускамі, па-беларуску размаўлялі, спявалі беларускія песні" (І. Навуменка).

Тут, далёка ад сваёй радзімы, Максіму вельмі спадабалася святкаванне Дзядоў, Каляд, Гукання вясны, Вялікадня... У 10 гадоў Максім самавукам стаў пісаць па-беларуску, потым у яго вершах "Сумна мне", "Вечар", "Не кувай ты, шэрая зязюля" прагучаць радкі з вядомых яшчэ з дзяцінства беларускіх народных песень.

Калі Максім пачаў вучыцца ў Ніжагародскай гімназіі, музыка яшчэ больш увайшла ў яго жыццё, у яго духоўны свет. І прычын тут было нямала. Нагадаем, што музычнае асяроддзе, у якім выхоўваўся паэт, не абмяжоўвалася толькі сям'ёю. А. М. Горкі меў непасрэдныя адносіны да Багдановічаў, як блізкі сябра Адама Ягоравіча і як сваяк. І, як вядома, на кватэры Горкага неаднаразова можна было пачуць геніяльнае майстэрства Шаляпіна. У 1911 годзе, пасля гімназіі М. Багдановіч паступае ў Яраслаўскі юрыдычны ліцэй. Там ён актыўна праводзіць літаратурныя вечары і своеасаблівыя канцэрты, на якіх выконваюцца беларускія народныя песні.

Верш "Уся ў слязах дзяўчына", які датуецца 1911 г., сведчыць аб блізкім знаёмстве М. Багдановіча з народнымі песнямі. Ключ для ўспрымання верша захаваны не толькі ў звычайным для народнай песні паралелізме вобразаў, але і ў характэрнай канцоўцы. У гэтым жа годзе М. Багдановіч прыязджае з Яраслаўля на Радзіму па запрашэнні рэдакцыі беларускай газеты "Наша ніва". Два месяцы працягвалася знаёмства з Радзімай. "Менавіта тут збылася мара паэта пасля доўгага растання. Тут, у Ракуцёўшчыне, створаны цыклы вершаў "Старая Беларусь", "Месца" і дзве паэмы "У вёсцы" і "Вераніка". Апошнія дзве паэмы ўвайшлі ў цыкл "Мадонны". Усё гэта потым уключана ў адзіны невялічкі памерам прыжыццёвы зборнік "Вянок", які выйшаў у 1913 г. у Вільні.

Вершы М. Багдановіча, уключаныя ў зборнік "Вянок" сталі яшчэ больш вядомымі шырокім масам, яны ўключаліся ў падручнікі-чытанкі і хрэстаматыі, выходзілі асобнымі выданнямі. Кожны школьнік завучваў на памяць адзін з найбольш вядомых твораў паэмы, яго несумненны шэдэўр, верш "Слуцкія ткачыхі". І невыпадкова праз многа год, ужо ў час Вялікай Айчыннай вайны, выдатны наш беларускі паэт-партызан Анатоль Астрэйка зборніку сваіх вершаў, які быў выдадзены ў глыбокім падполлі на радзіме "багдановічскіх ткачых", надаў назву – "Слуцкі пояс".

Пасля наведвання Беларусі М. Багдановіч плённа займаецца беларусазнаўствам, вывучае рускую і замежную літаратуру. У гэты час ён заканчвае Яраслаўскі Дзямідаўскі юрыдычны ліцэй. У кастрычніку 1916 года М. Багдановіч зноў прыехаў у Менск, каб дыхнуць "паветрам Бацькаўшчыны, пачуць жывую беларускую мову" і акунуцца ў атмасферу роднай песні. Паэт пасяліўся на кватэры З. Бядулі. Адразу стаў працаваць у Менскім губернскім харчовым камітэце, створаным творчай інтэлігенцыяй, які ставіў мэтай дапамагаць тым, хто пацярпеў у гады імперыялістычнай вайны. Камітэтам быў адкрыты клуб пад назвай "Беларуская хатка", дзе наладжваліся вечары беларускай народнай музыкі, паэзіі і песні, працавала сталоўка.

Пасля службы Максім Багдановіч звычайна наведвае Пушкінскую публічную бібліятэку (зараз Менская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна), да 3 – 4 гадзін раніцы працуе яшчэ дома. Ён часта выступае перад моладдзю, задумвае хрэстаматыю для пачатковай школы, многа піша. Паэт шмат часу аддаваў складанню беларускага буквара, літаратурнай хрэстаматыі, для якой напісаў нават некалькі нарысаў.

У гэты ж час ён піша адзін з самых драматычных твораў – верш "Пагоня". З-пад пяра паэта выходзіць паэма "Страцім-лебедзь", якая стала, як адзначаюць крытыкі, яго лебядзінай песняй. Максімаў Страцім-лебедзь закранаў прысутных слухачоў. У "Беларускай хатцы" разам са сваімі менскімі сябрамі М. Багдановіч сустрэў 1917 год.

Здароўе Максіма, між тым, пагаршалася. У лютым сябры пасылаюць яго лячыцца ў Ялту. Паэт і там напружана працуе. Піша вершы "Набягае яно...", "Пралятайце вы, дні...", "У краіне светлай, дзе я ўміраю...", плануе выданне новых зборнікаў, працягвае складваць беларускі буквар... Аднак намерам паэта не суджана было споўніцца. Сын Беларусі памёр у Ялце ад туберкулёзу на досвітку 25 траўня 1917 г., на 26-м годзе жыцця. Рукі чужых людзей пахавалі яго на Аўткінскіх могілках, непадалёк ад дачы Чэхава.

Сімвалам паэзіі Максіма Багдановіча стала слова "зорка". Талент паэта як зорка яркая свеціць людзям, дорыць нам "светлыя згадкі", будзіць у нашых сэрцах пачуцці прыгажосці, любоў да роднай Беларусі, да чалавека.

Узнікае пытанне. Ці захаваюць у сабе школьнікі добры купалаўскі, коласаўскі, багдановічскі агеньчык, калі стануць дарослымі? Ці стануць вершы класікаў беларускай літаратуры і песні, напісаныя на іх творы спадарожнікамі жыцця выпускнікоў школы, ці паклічуць іх да самаўдасканалення?

Аднак, не сакрэтам з'яўляецца той факт, што вучні не могуць назваць канкрэтныя імёны мастакоў, скульптараў, кампазітараў. Так, напрыклад, вучні чацвёртых класаў, дзе студэнты праходзілі педагагічную практыку, не змаглі адказаць на пытанне "Якую вы ведаеце оперу, пастаўленую паводле твораў М. Багдановіча? Хто аўтар музыкі і лібрэта?" (Опера "Зорка Венера", музыка Ю. Семянякі, лібрэта А. Бачылы. Вядома таксама поп-опера Ігара Паляводы "Максім" паводле твораў М. Багдановіча, лібрэта Л. Пранчака).

І музычны твор на верш паэта вельмі дапаможа настаніку, а дзеці ў сваю чаргу далучаюца да нацыянальна-музычнай культуры. У гэтай сітуацыі важна ведаць настаўніку не толькі тое, як яго слухаюць школьнікі, але і тое, як сам настаўнік настроены на слуханне музычнага твору.

"Зорка Венера ўзышла над зямлёю..." – адзін з самых вядомых вершаў М. Багдановіча. Дзякуючы таму, што твор пакладзены на музыку, вучні з задавальненнем услухоўваюцца ў словы цудоўнага рамансу. Яго можна паслухаць падчас першай размовы пра паэта. Пажадана, каб настаўнік пачатковых класаў перыядычна вывешваў табліцу-схему "Творы М. Багдановіча, пакладзеныя на музыку".

Навучанне літаратуры ўключае ў сабе не толькі веданне біяграфіі і твораў паэта, але і працэс вывучэння літаратуры, і штосьці "звыш таго" – творчасць. Менавіта творчы элемент і павінен ляжаць у аснове навучання літаратуры ў цеснай сувязі з прадметамі мастацка-эстэтычнага цыклу.

Няма патрэбы гаварыць, якую вялікую паслугу па вывучэнню літаратуры зрабілі тыя беларускія кампазітары і мастакі, якія пераклалі на мову свайго мастацтва класічныя творы літаратуры або стварылі паводле іх яркія арыгінальныя творы музыкі, жывапісу.

Музыкальна-паэтычная вартасць песень, рамансаў, музычных твораў, напісаных на словы М. Багдановіча выяўляюцца ў яркіх, даступных мелодыях, у вялікай вобразнасці. Валодаючы вялікай сілай эмацыянальнага ўздзеяння, песні, напісаныя на вершы паэта, служаць адным з сродкаў фармавання маральных і эстэтычных ідэалаў, а таксама развіваюць творчую ініцыятыву, садзейнічаюць больш глыбокаму пазнанню вобліку самога аўтара вершаў.

Табліца "Творы М. Багдановіча, пакладзеныя на музыку"

Аўтар	Назва верша	Кампазітары
Максім Багдановіч.	"Ноч"	муз. А. Багатырова
	"Лявоніха"	муз. А. Туранкова
	"Завіруха"	муз. Э. Тырманд А. Багатырова
	"Маладыя гады"	муз. А. Туранкова
	"Зімовая дарога"	муз. А. Туранкова Э. Тырманд
	"Слуцкія ткачыхі"	муз. А. Туранкова А. Багатырова
	"Зорка Венера ўзышла над зямлёю..."	муз. А. Туранкова А. Багатырова муз. С. Рак-Міхайлоўскага апрац. А.Багатырова, С. Палонскага
	"Зімой"	муз. Э. Тырманд
	"Вераніка"	муз. І. Лучанка

Да 110-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча

МАКСІМ БАГДАНОВІЧ І МУЗЫКА

(Новыя тэхналогіі выкладання творчасці М. Багдановіча)

Добра, яу у жыцці школьнікаў, калі яны стануць дарослымі, пакінуць след вершы Купалы, Коласа, Багдановіча і песні, напісаныя на іх вершы. Значыць творы класікаў ім дапамогуць у жыцці, значыць поруч з музыкальнымі творамі працягваюць жыць Купала, Колас, Багдановіч... Значыць поруч з намі жывуць гуманізм, мужнасць, вера, дух рамантыкі.

Між тым выкарыстанне такіх звестак дапамагло б у некаторай ступені засваенню не толькі літаратурнага твору, яго ідэі, але і далучэнню дзяцей да нацыянальнай культуры. Актыўнаму засваенню будзе садзейнічаць у гэтым выпадку, па-першае, змена відаў работы на ўроку, па-другое, "па сапраўднаму можна запомніць толькі тое, што па-сапраўднаму зразумела" і эмацыянальна адчута.

Мы думаем, што вучням пачатковых класаў настаўнік можа расказаць і аб гісторыі напісання "Слуцкіх ткачых", расказаць аб тым, якія канкрэтныя гістарычныя факты інтэрпрэтаваў Максім Багдановіч у вершы, і аб тым, што ў вершы адпавядае гістарычнай праўдзе. Адказ знаходзім у першым томе поўнага збору твораў Максіма Багдановіча.

Настаўніку трэба сказаць, што "напісанню верша папярэднічалі сустрэчы ў рэдакцыі "Нашай нівы" ўлетку 1911 г., падчас адной з якіх Максім Багдановіч меў магчымасць разглядаць прыгожыя па свайму вырабу залатабітныя, срэбнабітныя і шаўкабітныя паясы, што вырабляліся ў Слуцку на фабрыцы М. Радзівіла ў 1758-1844 гг. Як сведчыць бацька паэта, паясы зрабілі на яго вялікае ўражанне, ён па некалькі разоў пераглядаў іх. Змест верша "Слуцкія ткачыхі" не зусім адпавядае гістарычным звесткам. Вядомыя слуцкія паясы ніколі не выраблялiся прыгоннымі сялянамі ў панскім двары, для іх вырабу існавала ў Слуцку спецыяльная фабрыка (варштаты), заснаваная Міхалам Радзівілам у 1758 г. (аб гэтым гл.: Клышка А. Права на верш. – Мінск, 1967. – С.31).

У артыкуле І. Навуменкі "Суладдзе са святам прыроды" сказана: "Слуцкія паясы М. Багдановіч упершыню ўбачыў у музеі Івана Луцкевіча. І як бы наступіла паэтычнае азарэнне. Калі тут, на зямлі Беларусі, людзі здольны ствараць такое хараство, то гэта край выдатны і таленавіты. Паэт ведаў: паясы ткалі пераважна мужчыны, дзеля гэтага некаторых з іх пасылалі вучыцца рамяству ў Персію.. Але ён дзеля мастацкай ісціны, якая глыбей за факт, ігнаруе гэтую акалічнасць".

Кожны настаўнік павінен клапаціцца аб выхаванні творчай асобы. Для гэтага на ўроках трэба імкнуцца ўключаць вучняў у пазнавальную дзейнасць, выхоўваць любоў да даследчай працы. Пачынаць такую работу трэба з пачатковых класаў, паступова ўскладняючы задачы.

У адпаведнасці з тэмамі ўрокаў, звязаных з творчасцю Максіма Багдановіча, на пачатку ўрокаў вучні ІУ класаў робяць тэматычнае паведамленне "Дарогамі Максіма Багдановіча", "Максім Багдановіч і музыка" і так на ўроку, калі вывучаецца верш "Слуцкія ткачыхі" настаўнік піша прыкладны план зместу верша: 1. На чужыне. 2. Падняволъная праца ткачых. 3. Замілаванне родным краем. 4. "Цвяток радзімы васілька" (Т. І. Балдышэўская). Вызначаецца тэма твора – роздум паэта над лёсам і сутнасцю мастацтва; ідэя – любоў да сваёй радзімы. Вучням прапануецца праявіць творчасць пры маляванні ілюстрацый да зместу верша.

Настаўнік ставіць пытанне: "Чаму на тонкім узоры паясоў нечакана з'яўляецца "цвяток радзімы васілька?" Вучні адказваюць. Настаўнік падсумоўвае адказы вучняў і можа сказаць наступнае:

- Васілёк – нібы сімвал роднага краю, хоць ён у жыцці фактычна пустазелле, але сялянская рука ніколі яго не вырве. Бо чалавек зямлі тасама адчувае прыгажосць. З васількоў уюць вянкі, сціплая кветка радуе, нават натхняе. Разумная мэтазгоднасць у гэтым выпадку як бы саступае месца адчуванню прыгожага" (І. Навуменка). Дзяўчаты ў думках былі з родным карем "...дзе расцвіла вясна; Дзе блішча збожжа ў яснай далі, сінеюць міла Васількі...", і міжволі любоў да беларускай зямлі яны выказалі ў гэтым узоры. 'Забраныя ў панскі двор, адараваныя "ад родных ніў, ад роднай хаты", стомленыя непасільнай працай, прыгонныя ткачыхі сумуюць па роднай хаце, звяртаючыся ў думках да родных ніў і ў забыцці ткуць "заміж" персідскіх свае, беларускія ўзоры.

- Як суадносіцца жыццё Максіма Багдановіча з тэмай верша "Слуцкія ткачыхі"?

Вядома, Максім Багдановіч быў таксама лёсам адараваны ад Бацькаўшчыны, а сэрцам, вершамі жыў там. Кнігі ў бібліятэцы бацькі сталі таксама той крыніцай, што жывіла ўяўленні паэта пра далёкую Радзіму. Паведамленне суправаджаецца слуханнем песні А.Туранкова і А. Багатырова "Слуцкія ткачыхі".

Музычны матэрыял на ўроках літаратуры патрэбна выкарыстоўваць сістэматычна, на працягу ўсяго вучэбнага года. Настаўнік павінен папаўняць веды навучэнцаў пра музычныя творы, песні. Эфектыўнасць працэсу засваення зместу, ідэі мастацкага твора літаратуры будзе значна павышана, калі на ўроках літаратуры будуць выкарыстоўвацца метадычныя прыёмы і формы работы, скіраваныя на актывізацыю працэсу засваення літаратурнага твору, выкарыстанне твораў музычнага мастацтва, рэпрадукцый карцін і іншых відаў мастацтва пры вывучэнні творчасці беларускіх пісьменнікаў, а таксама тады, "калі настаўнік будзе выкладаць літаратуру як мастацтва" (М. Лазарук).

Бяспрэчна, творчы элемент на занятках па літаратуры не трэба разумець толькі як аналаг дзейнасці пісьменніка, мастака (вядома, на даступным дзіцяці ўзроўні). Але такі кірунак навучальнай дзейнасці вучняў выключна важны для ўваходжання іх у свет мастацтва. Эфектыўнасць працэсу засваення зместу, ідэі мастацкага твору літаратуры будзе значна павышана, калі на ўроках літаратуры будуць выкарыстоўвацца і музычныя творы, і творы жывапісу, і г.д., як гэта практыкуецца, напрыклад, у многіх агульнаадукацыйных школах Рэспублікі Беларусь. Інакш кажучы, каб вывучэнне літаратуры паглыбілася ў названых кірунках, неабходна на ўроках чытання ў пачатковай школе выкарыстоўвацца і метадычныя прыёмы і формы работы, скіраваныя на актывізацыю працэсу засваення літаратурнага твору, на выкарыстанне твораў музычнага мастацтва, рэпрадукцый карцін пры вывучэнні твораў беларускіх паэтаў, "калі настаўнік будзе выкладаць літаратуру як мастацтва".

З улікам патрабавання "выкладаць літаратуру, як мастацтва" і ўзнікае "выпрацаваны намер" звярнуцца па дапамогу да прадметаў мастацка-эстэтычнага цыклу. Навучанне і выхаванне творчасцю з выкарыстаннем сродкаў музычнага мастацтва на матэрыяле паэтычных твораў. Тут усё залежыць ад настаўніка, ад яго ведаў, культуры і эрудыцыі, а чым больш значныя яны, тым больш багаты і ўплыў педагога на сваіх вучняў. Сёння ніхто не аспрэчвае думку аб тым, што патрабуецца пераасэнсаванне шэрагу аспекту, пошук новых дыдактыка-метадычных тэхналогій і прыёмаў пры навучанні і выхаванні сродкамі літаратуры ў цеснай сувязі з прадметамі мастацка-эстэтычнага цыклу ў папчатковай школе.

Імя Максіма Багдановіча назаўсёды ўпісана ў нашу літаратуру. Вобраз яго – невычэрпная крыніца творчасці для жывапісцаў, скульптараў, музыкантаў, пісьменнікаў, паэтаў, людзей з народа.

Пульхныя воблакі яркага бэзу
Бы звар'яцелі зусім...
Ці яны ведалі, ці здагадаліся,
Што памірае Максім?

Крымскія сведкі
той жудаснай ночы
Не ўварваліся ў пакой,
Не супакоілі, не падзялілі
Гора, што йшло над Зямлёй.

А на стале,
што ў доме ля бухты
Плакаў ад крыўды "Вянок",
Сведка адчаю, болю і скрухі,
Дапамагчы ён не змог.

Пражыў Багдановіч
дваццаць шэсць маяў,
Рана ён свет пакідаў.
Музу душы яго
ў спадчыне маем,
Шчодрасць якой я спазнаў,

Чыстай душы
я гармонію гукаў
Чую, і – шэпт васілька:
- Смерці няма.
Бессмяротны музыка
Жыць застанецца ў вяках!
("Максіму")
Людміла Піскун,
г. Мазыр.

Вобраз Максіма Багдановіча ў беларускім выяўленчым мастацтве

9 снежня спаўняецца 110 гадоў з дня нараджэння М. Багдановіча

Святло паэзіі Максіма Багдановіча даходзіць да людской свядомасці, саграе нашы самотныя сэрцы, дае надзею. Па матывах яго вершаў і паэм пішуцца оперы, песні, ствараюцца жывапісныя палотны, графічныя серыі, скульптурныя кампазіцыі.

"Паэзія Багдановіча высякае іскры агню з чалавечай душы", - прызнаецца мастак Аляксей Марачкін, І сапраўды, літаратурная спадчына М.Багдановіча, яго творчасць для многіх і многіх – невычэрпная крыніца натхнення. Нават першая кніга Багдановіча "Вянок" (Вільня, 1913) звяртае на сябе ўвагу і сваім мастацкім афармленнем (імя мастака застаецца невядомым і сёння). Мы пазнаём на вокладцы стылізаваны васілёк – сімвал паэзіі Багдановіча. З пазнейшых варта адзначыць афармленне зборніка вершаў "Маладзік" (Мн., 1968) вядомым мастаком-графікам Яўгенам Кулікам – невялікі, удала выбраны фармат кніжкі васількова колеру, лаканічныя, выкананыя лёгкай графічнай лініяй малюнкі. На першай старонцы – партрэт Максіма Багдановіча, а на 118-й, дзе змешчаны верш "Слуцкія ткачыхі", бачым васілёк, нібы толькі што сарваны з жытнёвага поля і пакладзены між старонак. І якраз гэта ўдала знойдзеная дэталь узмацняе настрой чытача, выклікае яшчэ большую пяшчоту. Вобраз Максіма Багдановіча Яўген Кулік уводзіць таксама і ў афармленне кніжкі "Мушка-зелянушка і камарык – насаты тварык".

Цыкл графічных работ выканаў мастак Аляксандр Пашкевіч. Частка гэтых аркушаў знаходзіцца ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча. Да вобраза Максіма не аднойчы звярталіся Антаніна Лапіцкая і Міхась Басалыга. Яны стварылі пранікнёныя графічныя партрэты. Графік Іван Пратасеня стварыў у 1981 г. аркуш "Максім Багдановіч і Зоська Верас (Л.А. Сівіцкая) у Мінску".

Сярод скульптурных твораў згадаем скульптурны партрэт "Максім Багдановіч" (1927 г.) Аляксандра Грубэ. Сама скульптура, на жаль, не дайшла да нашага часу. Мы можам меркаваць пра яе мастацкую вартасць па рэпрадукцыі, якая зберагласся. Вядомы мастак Іван Рэй, у творчасці якога мы заўсёды бачым матывы роднага краю, стварыў палатно "Шлях паэта". Выява – скульптурна – аб'ёмная, манументальная. Максім Багдановіч у родным краі. Высокая стройная постаць яго пададзена на фоне крыжа-капліччкі, што ставіліся на скрыжаванні дарог як сімвал шматпакутнай гісторыі нашага народа, якому было наканавана несці свой крыж праз буры.

Вобраз маці ў Багдановіча – гэта вобраз мадонны. Ён натхніў на творчасць многіх, многіх мастакоў. Леанід Шчамялёў выканаў дзве работы – "На зямлі бацькоў" і "У краіне светлай". Л. Шчамялёў паказвае нам простага зямнога чалавека, прыгожага з твару, у вышыванай беларускай кашулі. Максім стаіць сярод вясковых дзяўчат і малых жанчын.

Карціна Нінель Шчаснай "Быць можа я не скончу жыць: М. Багдановіч" узнаўляе адну з трагічных старонак жыцця паэта – яго апошнія дні ў Ялце.

Скульптару Сяргею Вакару ўдалося ажыццявіць даўнюю задуму – паставіць помнік паэту Багдановічу на Траецкай гары, паблізу ад роднага дома Максіма. Сваю мару скульптар здзейсніў. У снежні 1981 г. сталіца нашай рэспублікі пабагацела яшчэ на адзін помнік, помнік М.Багдановічу, што ўзвышаецца насупраць Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета, стварае там адметны культурны асяродак, які сёння стаў месцам ушанавання памяці паэта, правядзення свята паэзіі.

Людміла Піскун.

Збіральнік скарбаў народных

Хачу я сказаць колькі слоў пра Васіля Змітравіча Ліцьвінку з нагоды ягонага юбілею, хаця сам не фальклярыст, ды і ведаю яго не так ужо даўно. Аднак завочна я з ім быў знаёмы многа болей, толькі, як і большасць жыхароў Беларусі – па тэлевізары. Мне вельмі падабалася глядзець перадачу "Запрашаем на вячоркі". Было ў ёй тое, чаму ў свой час не знаходзілася месца нідзе, апроч, можа, фальклёрных зборнікаў, - жывая народная творчасць, жывая душа народа. А душой саміх перадач быў яе вядовец – Васіль Ліцьвінка. Ён настолькі гарманічна ўпісваўся ў стылістыку тых перадач сваёй натуральнай манерай паводзін перад камерай, ладам гаворкі, аблічам, нават такім гаваркім, самым што ні на ёсць беларускім прозвішчам, што здавалася, нібыта ён сапраўды гасцюе і вядзе рэй на вяселлі, провадах у армію, або ў калядаванні. Пазней я прысутнічаў на рэпетыцы "Вячорак" у фае нашага факультэта і на свае вочы ўбачыў, як не проста дасягалася гэтая натуральнасць, нязмушанасць і праўдзівасць. Васіль Змітравіч сядзеў воддаль ад выканаўцаў і, здаецца, спакойна назіраў за танцамі і спевамі, не ўмешваўся ў работу кіраўніка ансамблю. Але потым тактоўна папраўляў, падказваў, як зрабіць лепей. Мусіць, якраз у тым, што Васіль Змітравіч ішоў у арганізацыі, падрыхтоўцы і вядзенні "Вячорак" ад назапашанага народам, а не ад нейкіх асабістых установак, што ён не навязваў свайго, і заключалася папулярнасць перадачы. Кожная была іншай, не падобнай на папярэднія, кожная адкрывала нешта новае. І ў той жа час адгукалася ў душы гледачоў, нягледзячы на тое, што не заўсёды яны бачылі абрады і святы, якія бытуюць і ў іх мясцовасці. Памятаю, як я разам з сястрой глядзеў аднойчы перадачу пра вяселле, і мы абое не маглі стрымаць слёз, бо згадвалася сваё, не аднойчы бачанае ў нашых родных Верацях на Пастаўшчыне. Хай сабе на экране было і не ўсё гэтак, як у нашых мясцінах, але ўсё роўна гэта было сваё, дарагое і незабыўнае. І як шкада, што гэтая перадача па тэлебачанні звялася. Але яна мела свой плён: не дала звесціся народнай творчасці, застацца толькі ў памяці бабулек і дзядоў, натуральны, аўтэнтычны фальклёр стаў больш шанавацца, самадзейныя калектывы пачалі арыентавацца менавіта на яго, а не на модныя эстрадныя песенькі. У гэтым несумненная заслуга Васіля Ліцьвінкі.

Другі раз я не мог стрымаць слёз, калі па запрашэнні Васіля Змітравіча прыйшоў на Вялікдзень у Траецкае прадмесце, дзе фальклёрныя калектывы з розных раёнаў спявалі вялікодныя песні. Хоць сам я ніколі з валачобнікамі не хадзіў, напамяць тых песень не ведаў, але ж колькі разоў чуў, і як яны нагадалі мне дзяцінства, калі я малы, схаваўшыся на печы, слухаў, як пад вакном спявалі "Вялік святы нам дзень настаў..." Згадваю гэта таму, што Васіль Ліцьвінка быў адным з ініцыятараў правядзення падобных выступленняў. І ён мае дачыненне да таго, што не толькі па вёсках, але і ў гарадах, у Менску цяпер калядуюць, ходзяць валачобнікі, адзначаюцца паводле народных звычаяў спрадвечныя нацыянальныя святы. А гэта даражэй за многае іншае.


Васіль Ліцьвінка ў рабочым кабінеце


Мне было вельмі прыемна пазнаёміцца з Васілём Змітравічам асабіста, а пазней быць з ім у адным працоўным калектыве. Аказалася, што ён, як і на экране, у жыцці такі самы вясёлы, дабразычлівы, апантаны сваёй любімай справай. Ён з тых людзей, якіх называюць кампанейскімі. Але не кожны можа аказацца "у кампаніі" з ім, а толькі той, хто, як і ён, захоплены любімай справай, хто нястомна працуе, робіць нешта карыснае для Бацькаўшчыны.

Ягоны галоўны занятак – збіранне і апрацоўка фальклёру. Тут Васіль Змітравіч прызнаны спецыяліст, яго эрудыцыя ў фальклярыстыцы – выключная. Ён выдатна ведае не толькі беларускі, але і рускі, украінскі, польскі, балгарскі, сербскі фальклёр, падтрымлівае сувязі з вучонымі-фальклярыстамі многіх замежных краін. Мабыць, немагчыма падлічыць, колькі ён сабраў узораў народнай творчасці, колькі трымае ў памяці песень, і не толькі трымае але і выдатна спявае іх. Аднойчы ў размове Васіль Змітравіч успамінаў, як ён яшчэ ў 70-я гады пазнаёміўся з Рыгорам Рыгоравічам Шырмам, як быў запрошаны ў госці, і збіральнік беларускага песеннага фальклёру не адпускаў маладога вучонага, слухаў песні, якія сабраў сам Ліцьвінка. А яму ўжо тады чым падзяліцца. Яшчэ ў дзяцінстве ён уведаў ад маці, бабулі, аднавяскоўцаў нямала рэдкіх песень, багата песенных скарбаў сабраў і тады, калі пачаў мэтанакіравана займацца фальклярыстыкай.

Рыгор Шырма стаў для Васіля Ліцьвінкі своеасаблівым узорам сапраўднага рупліўцы-збіральніка і захавальніка створанага народам. У ягоным рабочым кабінеце вісіць партрэт Шырмы, і гэта своеасаблівы сімвал працягу традыцый, наследавання, пераемнасці. Васіль Змітравіч не толькі пайшоў шляхам фальклярыста-песенніка, але і даследаваў яго жыццё і творчую дзейнасць у паспяхова абароненай у 1984 годзе кандыдацкай дысертацыі "Рыгор Шырма – фальклярыст".

Васіль Змітравіч аб'ездзіў у пошуках скарбаў народнай творчасці шмат запаветных мясцін Беларусі, але асабліва цікавіла яго роднае Палессе. Менавіта там адшукаліся такія рэдкія матэрыялы, якіх вучоныя ўжо не спадзяваліся знайсці. Так, у вучоным свеце выклікала вялікае здзіўленне тое, што Васіль Ліцьвінка запісаў унікальны абрад радзімічаў "Ваджэнне і пахаванне стралы", а таксама не менш старажытны – "Ваджэнне куста". І падобных рарытэтаў у архіве фальклёрных твораў, сабраных ім і студэнтамі і выкладчыкамі БДУ надзвычай многа.

Васіль Змітравіч заўсёды ў гушчыні спраў, звязаных з фальклёрам. Ён узначальвае навукова-даследчую лабараторыю беларускага фальклёру БДУ, Беларускі саюз фальклярыстаў, займаецца навуковай, выкладчыцкай, лектарскай дзейнасцю. У яго кабінеце частыя госці тыя, каму патрэбна дапамога, кансультацыя, парада, хто хоча знайсці апірышча ў сваіх звязаных з фальклёрам справах. Хаця "Вячоркаў" цяпер няма, але ён па-ранейшаму апякуецца фальклёрнымі калектывамі, дапамагае ім, чым можа. Перадае свой досвед маладым, рыхтуе новых рупліўцаў-збіральнікаў і даследчыкаў фальклёру. Хаця ім напісана больш за дзвесце навуковых прац, сярод якіх ёсць і шэраг салідных манаграфій, але Васіль Змітравіч не спачывае на лаўрах, ён назапасіў матэрыялу на дзесятак новых кніг, хоча абавязкова скарыстаць яго. А ў планах – новыя пошукі: На Браслаўшчыне, у Белавежскай пушчы, ля Нарачы і ў Прыпяцкім запаведніку. Распачата важная справа захавання і папулярызацыі беларускай вуснай народнай творчасці. Фальклёрная лабараторыя, якая сёлета таксама адзначае юбілей – дваццаць год існавання – пад кіраўніцтвам Васіля Ліцьвінкі працягвае сваю збіральніцкую, навуковую, выхаваўчую і папулярызатарскую дзейнасць.


У навукова-даследчай лабараторыі беларускага фальклёру БДУ

"Вялік дзень", дзень юбілею настае для Васіля Змітравіча Ліцьвінкі. Ён сустракае гэтую дату з важкімі набыткамі, і, што галоўнае, з творчым гарэннем, з надзеяй яшчэ многа зрабіць. Хаця твар юбіляра і ўпрыгожвае барада, але па ягонай энергічнасці, апантанасці і захопленасці ён выглядае маладым, і ён і ёсць малады, і ў яго наперадзе новыя здзяйсненні, новыя юбілеі. Хочацца пажадаць, каб усё ў ягоным жыцці было добра, каб здароўя, энтузіязму і шанцавання хапіла яму на добрыя справы!

Міхась Кенька,
дацэнт кафедры
тэорыі літаратуры БДУ.



Каляндар свят і абрадаў беларусаў на 2002 год. Аўтар Васіль Ліцьвінка

Нацыяналіст – харошае слова, не палохайцеся!

На мінулым тыдні студэнты і выкладчыкі філалагічнага факультэта ГДУ ім. Ф Скарыны мелі цудоўную магчымасць пагутарыць з выдатным літаратуразнаўцам, крытыкам, фальклярыстам, перакладчыкам ды канечне паэтам Нілам Сымонавічам Гілевічам. Мерапрыемства, арганізаванае таварыствам "Кніга", праходзіла ў актавай зале ўжо згаданай ВНУ. Вядома, што людзей, якія жадаюць сустрэцца з сапраўдным мастацтвам набралася шмат, таму памяшканне было перапоўнена, як гаворыцца, яблыку не было дзе ўпасці.



На здымку: Ніл Гілевіч у фальклёрнай лабараторыі кафедры беларускай літаратуры і мовы Гомельскага Дзяржуніверсітэта імя Ф. Скарыны. Фота Сяргея Халадзіліна, БелТА.

Першым выступіў прафесар, доктар навук, загадчык кафедры беларускай літаратуры ГДУ І.Ф. Штэйнер. Ён і прадставіў прысутным паэта. А пасля да мікрафону выйшау сам Гілевіч. Творца пажадаў моладзі не кідацца ў адчай, верыць у справядлівасць, у яе сілу і перамогу, навучыцца адрозніваць праўду ад хлусні, бо апошняй, на думку пісьменніка, надта шмат зараз у нашым грамадстве. Ніл Сымонавіч прапанаваў весці размову ў вусна-пісьмовай форме: гэта значыць кожны мог падаць лісток са сваім пытаннем на сцэну і атрымаць адказ. На такі дыялог усе хутка пагадзіліся, а таму Іван Штэйнер ледзь паспяваў збіраць і перадаваць лісткі. Гаворка пайшла і пра Чарнобыль, і пра каханне, і пра натхненне, і пра колькасць, напісанных паэтам вершаў, і пра мэтазгоднасць атрымання дыплому пры наяўнасці таленту... Але на мой погляд найбольш ключавымі ды важнымі былі вось якія два пытанні і адказы:

— Скажыце, калі ласка, ці падабаецца вам сённяшняя беларуская моладзь у плане адносін да Радзімы, да сваёй мінуушчыны?

– Мне вельмі падабаецца, што моладзь вывучае гісторыю, пачынае даражыць, ганарыццам нашым уласным, гісторыяй беларускага народа, яго духоўнымі скарбамі. На колькі мяне хапае, я сачу за гэтым і падкрэсліваю, вельмі радуюся за моладзь. Канешне, вялікая частка яе яшчэ не паднялася да такога ўзроўню, да духоўнага пачатку ў поўным сэнсе слова. Трэба ім дапамагчы. Ёсць моладзь, якая называецца нават нейкім патрыятычным словам, але я колькі іх не слухаю па радыё, па тэлебачанні, яшчэ ніводнага беларускага слова ад іх не пачуў. Не, вы ўяуляеце себе патрыёта Польшчы, які не скажа ніводнага слова па-польску, патрыёта Венгрыі, які не скажа ніводнага слова па-венгерску! Нонсэнс! Абсурд поўны! Не можа такога быць! А ў нас аказваецца можна быць патрыётам і ўваходзіць у нейкі саюз патрыятычны, але двух слоў не звязаць на мове гэтай зямлі. Пра што гаворка! Навучыцеся спачатку, гэта я ім кажу, сапраўды шанаваць Беларусь, гісторыю нашага народу, яго мастацтва, мову, тады мы пагаворым пра патрыятызм і што гэта такое.

– Як вы ставіцеся да творчай спадчыны Багдановіча, Багушэвіча?

– Багушэвіч першы зрабіў мяне нацыяналістам. Нацыяналіст – харошае слова, не палохайцеся! Гэта значыць, зрабіў патрыётам беларускай мовы, Беларусі. А Багдановіч – мая першая і да гэтага часу любоў.

Кожны прачытаны пісьменнікам верш зрываў апладысменты, а асабліва спадабаліся і запомніліся прысутным у зале вершы пра красну-дзеўку ды бел-малойчыка.

Сустрэча была настолькі цікавая, што ніхто і не заўважыў, як праляцелі адведзеныя на яе дзве гадзіны. І хоць нам давялося расстацца з Нілам Гілевічам, але ў сэрцы ўсё яшчэ гарыць агонь натхнення, што запаліў пісьменнік, як не гасне і надзея, што такія мерапрыемствы стануць больш частай з'явай у ГДУ імя Ф. Скарыны.

Наталля Старчанка,
студэнтка 1 курса
філалагічнага факультэта
ГДУ імя Ф. Скарыны.

---

*Ад народнага майстра па лазапляценню, равесніка, матэматыка **Міколы Валошчыка** шчырае віншаванне шаноўнаму Народнаму паэту Беларусі **Нілу Гілевічу** ў сувязі з яго 70-годдзем.*

Віншаванне шлю паэту,
Хто ўсяму паведаў свету:
-Роднай мовы й Беларусі
Я ніколі не зракуся.

Шлю, шаноўны Ніл, сягоння
Пажаданне працы плённай,
Сіл, здароўя і надхнення.
Шмат зрабіць
для Адраджэння.

Спадзяванне не загіне
І надзея не пакіне.
Як нясе Ніл кліч народу
Йсці змагацца за Свабоду.

Ваша скруха за Радзіму
Сыйдзе з чорнай хай гадзінай.
А Ваш палкі заклік змусіць
Сну пазбыцца беларуса.

г. Белаазёрск.

Каласавіны – 2001

У пачатку лістапада, як звычай, Дзяржаўны мемарыяльна-літаратурны музей Якуба Коласа арганізаваў вандроўку па коласаўскіх мясцінах. Удзячваючы пастаянны склад удзельнікаў вандроўкі, вырашылі ўключыць у маршрут новыя мясціны: пазнаёміцца з Уздзеншчынай, пашырыць веды пра Стаўпеччыну.

Першай вандроўнікаў сустрэла славутая вёска Нізок. Дырэктар базавай школы Зміцер Судкаленка і яго жонка Вольга правялі ў школьны музей, дзе вучні на пявучай, не сапсаванай інтэрферэнцыяй мове паведамілі пра слынных аднавяскоўцаў: Паўлюка Труса, Кандрата Крапіву, Лідзію Арабей і інш. Спадарыня Лідзія Арабей, якая знаходзілася сярод прысутных, шчыра гублялася ад пачцівай увагі.

Гурт "Суседкі" Кухціцкага сельскага Дома культуры (кіраўнік – Алег Якубоўскі) віталі гасцей і словам і песняй. Ганна Міхальчук, загадчык аддзела культуры Уздзенскага райвыканкаму, зладзіла цікавае знаёмства з гісторыяй і сучаснасцю Уздзеншчыны. Тамара Лухверчык, намеснік дырэктара гісторыка-краязнаўчага музея, правяла па залах, расчыніла гераічныя старонкі сівой мінуўшчыны свайго краю. Рэдактар раённай газеты, кіраўнік літаратурнага аб'яднання "Нёманец" Віктар Сабалеўскі распавёў пра літаратурныя дасягненні людзей Уздзеншчыны, пра выданне 19 кніжак мясцовых аўтараў.

Вёска Стальбоўшчына, што на Стаўпеччыне, таксама сустрэла песняй – бел-чырвона-белымі колерамі народных строяў свяціліся ўдзельнікі гурта "Жывіца", вакальнага трыё народнага хору "Нёман" Старасвержанскага ДК. Дырэктар школы Лідзія Луцэвіч, настаўніца Зінаіда Жыбуль і вучні ў музеі Алеся Пальчэўскага пазнаёмілі з гераічнымі і трагічнымі старонкамі жыцця пісьменніка. Асабліва ўразіў эпізод з лістом у НКВД, дзе знаходзіўся данос на пісьменніка. Блізкі сябар папрасіў Алеся ўкінуць яго ў паштовую скрыню. Атрымліваецца, што 17-гадовае адбыццё ссылкі паэт улучыў у свой лёс сваімі рукамі. Пачатак стварэння музея зрабіла жонка Пальчэўскага грузінка Тамара, аддаўшы ў школу амаль усе рэчы з іх хаты.

Каторы ўжо год на Каласавіны сустракала гасцей сусветна вядомая Мікалаеўшчына. Па-восеньску звонкая, святочная гаманлівая. Цікавыя словы ля помніка класіку сцішвалі лістападаўскі пранізлівы вецер. Прысутнасць дзядзькі Міхася – сына Якуба Коласа, унучак слыннага песняра – Марыі і Веры, шматлікіх сваякоў нагадвалі пра несціханы рух жыцця.

Такое ж пачуванне ахапіла і ў Смольні, славутай на сустрэчу двух класікаў. І прымацаваныя да хаты барана, рэзгіны, баба (гнуць дугі) таксама сцвярджалі пераемнасць быцця. Там жа ў Смольні адбыўся цікавы лінгвістычны эпізод. Намеснік амерыканскага амбасадара Джон Кунштадтар, які вывучае нашу мову, прадэманстраваў захаплялььнае веданне слоў ***рэзгіны, барана, гонта*** і інш. З групы маіх студэнтаў-першакурснікаў такіх знаўцаў было толькі двое.

Сапраўды, Беларусь – цікавая краіна. Толькі тут можна пачуць, як гавораць па-беларуску татары, яўрэі, палякі, азербайджанцы, літоўцы, цяпер ужо і амерыканцы, нават японцы, а вось некаторыя беларусы, на жаль, не. Дзякуй Богу, што гэтая незайзросная адметнасць абышла хату дзядзькі Якуба. А магла ж здарыцца жахлівая бязглуздзіца, бо ўнучка Марыя ў 60-х гадах, калі пасля "славутай" Пастановы ЦК КПСС 1958 усе бацькі-беларусы навыперадкі кінуліся вызваляць дзяцей ад вывучэння роднай мовы, не магла знайсці клас, дзе вывучалася б мова. А праўнукі Васіль і Васілінка, вучачыся ў беларускай гімназіі № 5, зведалі пасля рэферэндуму 1995 г. "славуты адкат" беларусізацыі.

Але нягледзячы на зігзагі ўвагі краіны да роднай мовы, апошняя і сцвярджаецца, і ўсталёўваецца. Хай сабе і людзьмі з замежжа. Хай сабе і часткай свядомых беларусаў. Хай сабе і нашчадкамі выбітных продкаў. Але жыве!

Людміла Дзіцэвіч,
першы намеснік
старшыні ТБМ.

АД СЭРЦА ДА СЭРЦА

Пад апладысменты, 14 кастрычніка 2001 года, гасцінна адчыніла дзверы вечарына, прысвечаная сустрэчы з вядомымі беларускімі пісьменнікамі Уладзімірам Арловым і Зміцерам Бартосікам у чытальнай зале філіяла № 7 Цэнтральнай бібліятэкі імя А.С.Пушкіна горада Мазыра.

Вечарыну распачаў пісьменнік Уладзімір Арлоў, які расказаў коратка біяграфію Зміцера Бартосіка. Прыехаўшы на Беларусь, Зміцер, па нацыянальнасці – рускі, вельмі палюбіў мілагучную беларускую мову, беларускія песні, каляндарна-абрадавыя святы, чытаў вершы беларускіх паэтаў, кнігі беларускіх пісьменнікаў. Зміцер Бартосік добра ведае гісторыю Беларусі, прафесійна валодае беларускай мовай, складае беларускія песні і выконвае іх пад акампанемент гітары.

Вучні агульнаадукацыйных школ і настаўнікі, чытачы-пенсіянеры, студэнты факультэта педагогікі і методыкі пачатковага навучання, усе прысутныя на адным дыханні слухалі песні, якія выконваў Зміцер Бартосік. Бурныя воплескі суправаджалі кожную песню, прымушалі Зміцера спяваць ізноў на тэму "З гісторыі Беларусі".

Спакойны, з усмешкай, так характэрнай для спевака, абвеяны нейкай ціхай журбой беларускай мінуўшчыны, - усё гэта зачаравалася ў песнях барда Зм. Бартусіка.

Уражанні былі самыя лепшыя ў прысутных, калі слухалі слыннага пісьменніка Уладзіміра Арлова. Што ж тычыцца маладых людзей, якія цікавяцца гісторыяй сваёй краіны, у іх абудзілася пачуццё патрыятызму, яны зразумелі, што моладзі ёсць за што любіць сваю Бацькаўшчыну. Гэтую любоў прынеслі кнігі У. Арлова, песні Зм. Бартосіка. Гэтую любоў да Бацькаўшчыны яны спазналі з твораў класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча... І сёння, на сустрэчы з жывымі пісьменнікамі, пачуццё патрыятызму абудзілася мацней.

Вялікі рэзананс выклікала эсэ Уладзіміра Арлова "Незалежнасць – гэта..." – тэкст, у якім па-філасофску закранаюцца ўсе бакі жыцця краіны: і палітычны, і эканамічны, і духоўны.

Прыемна было пачуць словы падзякі мазыранам. У.Арлоў адзначыў, што людзі горада Мазыра – ініцыятыўныя, аптымістычныя, што горад "Мазыр не спіць".

Словы, адрасаваныя вучням, студэнтам, моладзі, былі напоўнены азарэннем духоўнасці. Словы сягалі ўвысь, узвышаючы слухача, робячы яго асобай, індывідуальнасцю.

Сустрэча з пісьменнікамі яшчэ раз пераканала прысутных у тым, што трэба ведаць свае карані, гісторыю сваёй Бацькаўшчыны, трэба любіць яе. Любоў да радзімы – гэта і веданне яе гісторыі, гэта – і павага да бацькоўш, дзядоў, гэта – абуджэнне пачуцця нацыянальнай самасвядомасці, пачуцця гонару за родную мову, пачуцця годнасці, бо патрыёта без пачуцця годнасці не бывае.

Ад сэрца да сэрца, асабліва надзённа, выклікаючы шчыры душэўны водгук прысутных, гучалі фрагменты з выступлення У. Арлова і песень Зм. Бартосіка.

У заключэнне аўтар 25 кніг пра Беларусь, пісьменнік У. Арлоў сказаў шчырыя словы ў адрас сённяшняй моладзі. Адзначыў, што яна больш смелая, што моладзь мае намнога больш магчымасці доступу да сусветнай культуры. Пажадаў, каб моладзь больш цаніла сябе, свае намаганні на ніве беларушчыны, на ніве адраджэння сваёй нацыянальнай культуры.

Вечарына скончылася, аднак прысутныя не разыходзіліся: кожнаму хацелася пагаварыць з пісьменнікам, узяць аўтограф, набыць яго кнігі.

Дацэнт педінстытута ад імя ўсіх прысутных падзякавала пісьменнікаў за свята духоўнасці і выказала думку аб тым, што студэнты ф-та ПіМПН напішуць свае ўражанні ў інстытуцкую газету "Мазырскі педінстытут".

Дацэнт ***Людміла Піскун,***
Студэнты: ***Ірына Ганчар,***
Жанна Абрамовіч.

Ён прыйшоў да Беларусі ў Севастопалі


Валер Барташ – старшыня Севастопальскага таварыства беларусаў імя М. Багдановіча "Пагоня". Адвакат. Беларус, апантаны ідэяй незалежнасці. Інтэлектуал.

Я шмат чула пра сп. Барташа, ведала яго завочна, таму з нецярпеннем чакала сустрэчы. І першая непрацяглая гутарка ў сядзібе ТБМ у Менску падагрэла жаданне яшчэ больш даведацца пра такую цікавую асобу, пагутарыць.

Спраўдзіць сваё жаданне змагла ў Севастопалі. Цягам дзесяці дзён мела стасункі з гэтай незвычайнай асобай. Менавіта такое ўяўленне пра Барташа ўзнікла, калі я пабачыла сядзібу СТБ. Бел-чырвона-белыя сцягі, выявы герба "Пагоня", палотны карцін з беларускімі сюжэтамі, беларуская кераміка, саломка... І кнігі. Мноства кніг, сапраўднае кніжнае валадарства. Сярод іх – даволі прыстойная бібліятэка беларускіх кніг. Далёка не кожны ў Беларусі мае такую. Адразу падумалася – як змог гаспадар сядзібы вывезці з Беларусі такі груз. І вырастала глыбокая павага да земляка, які ладзіць грунтоўную беларускую прастору на ўкраінскім грунце. Ладзіць дасканала, уражвальна, з нязменнай беларускай сціпласцю. Пра сябе гаварыць не любіць, адразу пераводзіць гутарку на аповеды пра беларусаў-севастопальцаў. Можа гадзінамі захапляцца самаахвярнай працай сваіх сяброў у Таварыстве. Аднак мне ўдалося ўсё ж такі пагутарыць са сп. Барташам пра ягоную асобу.

- Раскажыце на пачатку трохі пра сябе.

- Бацькі мае – беларусы з Магілёўскай вобласці. Бацька з Круглянскага раёна, а маці з Бялыніцкага, з вёскі Каскевічы. Там я і нарадзіўся. Бацька – афіцэр Чарнаморскага флоту, і ў 3-гадовым узросце я трапіў у Севастопаль.



Валер Барташ на Чорным моры

У сям'і было трое дзяцей, мае сястра і брат жывуць таксама ў Севастопалі. Школу закончыў тут, быў матросам, браў удзел у археалагічных экспедыцыях, раскопках, калі працаваў у музеі Херсанескага заказніка. Потым служба ў арміі, пасля – юрфак Адэскага універсітэта.

- Калі ўпершыню адчулі свае беларускія карані?

- Гэта адбылося ў Чэхіі ў 1968 годзе, калі салдатам далучыўся да падзеяў на чэхаславацкай зямлі. Успрыняў "міратворчую" акцыю Савецкай арміі як гвалт, а да чэхаў з'явілася спачуванне. Тады ж і адчуў уласную нацыянальнасць. Чэхі ж прытулілі нашага Скарыну.

- Калі пачулі пакліканне Бацькаўшчыны на актыўную працу?

- Пасля рэферэндуму 1995 года. Успрыняў яго як знявагу сябе і народа. Да гэтага ўжо цікавіўся беларушчынай, пасля атрымання Беларуссю незалежнасці чытаў беларускія газеты і часопісы, займаўся грамадскай дзейнасцю. Адмена святых для кожнага беларуса сімвалаў – герба, сцяга, наступ на мову – ўсё гэта стала апошняй кропляй. Вырашыў згуртаваць землякоў. Беларусаў ведаў па працы ў адвакатуры. Запрасіў на сход, было чалавек дзесяць, у асноўным юрысты. Спачатку ўтварылі аб'яднанне "Бацькаўшчына", а потым ужо далучылі імя М. Багдановіча.

- Калі ўпершыню пасля 1963 г. трапілі ў Беларусь?

- У Беларусь зноў пасля працяглага перапынку прыехаў у 1997 годзе. Прыйшоў у музей Максіма Багдановіча, пазнаёміўся з дырэктарам. Алесь Бяляцкі даў пачытаць кнігу Ул. Арлова "Адкуль наш род". завязаў добрыя кантакты з ЗБС "Бацькаўшчына", з Беларускім народным фронтам, з беларускай элітай: навукоўцамі, скульптарамі, мастакамі. Быў рады знаёмству з сям'ёй Марачкіных. Быў дэлегатам II і III з'езду беларусаў свету "Бацькаўшчына", усебеларускага з'езду. Першы сход беларусаў Севастопаля па згуртаванні ў арганізацыю і правялі пасля майго вяртання з II з'езду беларусаў свету ў 1997 г.

- Як я разумею, Вы не вывучалі беларускую літаратуру. Калі ўпершыню пачулі імя Багдановіча, далучыліся да яго творчасці?

- 20 гадоў назад быў у санаторыі ў Ялце і тады ўпершыню пачуў імя Максіма Багдановіча. Купіў у кнігарні анталогію беларускай паэзіі, прачытаў Багдановіча. Спадабалася. Пачуў па радыё – спаўняецца 90 гадоў беларускаму паэту, які пахаваны ў Ялце. Стаў шукаць магілу яго, але не знайшоў, бо трапіў на другія могілкі. На сотыя ўгодкі Багдановіча на яго магіле таксама не быў.

- Калі першы раз пабывалі на магіле М. Багдановіча?

- Гэта было пасля прыезду з II з'езда беларусаў свету ў 1997 годзе. Сабралася нас 25 чалавек, заказалі аўтобус. На магіле ўсталявалі сцягі бел-чырвона-белыя. Стаў расказваць усім пра Багдановіча, бо многія зусім яго не ведалі. Чыталі вершы. цяпер звычайна ездзім туды на дзень народзінаў Максіма, у жальбінны дзень памяці яго, а таксама пасля сходаў. Спяваем "Пагоню", чытаем вершы. асабліва гэта ўдаецца Ганне Станіславўне Малахоўскай-Васюнінай, яна ведае вельмі шмат на памяць з Багдановіча, хораша дэкламуе. Зладзілі ўжо не менш за 10 такіх вандровак да нашага Максіма.

- Што са спадчыны Багдановіча Вам асабліва падабаецца?

- Вядома, "Пагоня", серыя "Змяіны цар". Вельмі люблю публіцыстыку – гэта з'явілася для мяне адкрыццём. Увогуле люблю ўсё – асабліва пра беларускае адраджэнне. Я ўсім раздаваў матэрыялы пра Багдановіча, бо нам яго трэба ведаць.

- Што яшчэ з беларускай літаратуры Вас зацікавіла?

- Я добра не ведаю нашай літаратуры. Чытаў Купалу. Увогуле добра, але не падабаюцца охі і стогны пра нашае пакутнае жыццё. Не люблю ў нашай літаратуры непавагу да сябе, гаротнасць, прыніжанасць. Люблю пагэтаму вольналюбства Геніюш. Яна сама і яе паэзія – гэта нешта незвычайнае. Упершыню прачытаў Геніюш у "Нёмане". Калі б мы не адкрылі для сябе Багдановіча, то, напэўна, увялі б у назву нашага Таварыства імя Ларысы Геніюш. Люблю Адама Міцкевіча. Яго творчасць працягвала яшчэ з юнацкіх гадоў. ужо тады я адчуваў, што ён наш, беларус. Асабліва падабаюцца "Крымскія санеты". Чытаю ўсё па гісторыі, беларусазнаўстве. Ведаў Адама Мальдзіса, Міколу Ермаловіча і другіх слынных навукоўцаў яшчэ да сустрэчы з імі. Цяпер думаю, як мала трэба, каб разбудзіць у сабе патрыятычныя пачуцці.

- А якія ў Вас стасункі з нашай мовай? Вы ж яе таксама не вывучалі.

- На мове я не размаўляю. Але ўпэўнены, што тады чалавек мае свой твар, калі ведае сваю мову. Не разумею, калі саромеюцца сваёй мовы, як многія афіцэры ў Севастопалі, якія закончылі беларускую школу. Люблю чытаць, навучыўся гэтаму цераз газету "ЛіМ". А разумець стаў пасля штодзённых слуханняў радыё "Свабода". Калі ўпершыню стаў чытаць на сваёй мове, было вельмі непрывычна. Цяпер разумею лепш, чым украінскую. А да сваёй мовы прыйшоў цераз польскую, шмат прачытаў з польскай літаратуры, асабліва паэзіі. Цяпер стараюся, каб у Севастопалі гучала наша мова. Упершыню ў горадзе пачулі яе ў 1997 годзе па радыё, калі мы распачалі радыёперадачы, якія вядзём не перарыўчыва ўжо 4 гады, па 30 хвілін у месяц.

- Як успрынялі людзі, што акружаюць Вас, гэтае вяртанне да Радзімы?

- У маёй сям'і – жонка, сын і дачка з разуменнем і падтрымкай, калегі – з павагай, бо бачаць ад мяне карыслівасць, а змаганне за ідэю. Украінцы – з удзячнасцю за адстойванне супольных інтарэсаў, рускія – з разуменнем і згодай, беларусы прасавецкія – адвярнуліся з хамствам, крыклівасцю, пыхай. Лічу, што з імі не варта мець зносін. Увогуле лічу, што аснова чалавека – у адносінах да нацыянальнага, у павазе да гісторыі, мовы. Я люблю свой народ і паважаю другія. Вельмі агідна было глядзець, калі Ціцянкоў раздзіраў наш сцяг. Гэта халуйства, жывёльнасць. Кожнаму трэба адшукаць у сабе і чалавечую, і нацыянальную годнасць і паяднаць іх. Я вельмі рады, што мне гэта ўдалося.

- Дзякуй за гутарку.

Гутарку вяла Людміла Дзіцэвіч, першы намеснік старшыні ТБМ.

Па розныя бакі межаў

Мяжа: 1) вузкая палоска неўзоранай зямлі паміж палеткамі, участкамі, уладаннямі; 2) пагранічная лінія паміж сумежнымі дзяржавамі; граніца; 3) парадак паводзін, форм абыходжання, рубеж чаго-небудзь дазволенага. (Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы – 2-ое выд. – Мн.: БелЭн, 1999, - 784 с.).

Праязджаючы ў сваю родную вёску, пастаянна заходжу на былую сядзібу сваіх бацькоў. Тут прайшло маё дзяцінства, тут давялося быць сведкам суседскіх спрэчак за межы сваіх агародчыкаў. Цяпер там цішыня. Смерць паяднала суседзяў, а зямля запанілася агульным у чалавечы рост быльнягом. Не знайсці ўжо, дзе была тая мяжа. Тое ж назіраецца і зараз у нашым садовым таварыстве. Не могуць абмежавацца адно ад другога без пасярэднікаў двое садаводаў. І мне, адказнаму за ўрэгуляванне такіх спрэчак, даводзіцца нагадваць прыклад з роднай вёскі.

Межы вызначаюць супрацьлегласць. Мяжа, гэта свайго роду фронт. Да смерці не забуду мяжу, якая пралегла паміж сённяшнімі ўладаўтрымальнікамі і абаронцамі памяці загінуўшых у Курапатах пад час бальшавіцкага тэрору. Гэтай мяжой выпала стаць дарозе – дарозе праз Курапаты. О, колькі спрэчак давялося мець, а цяперашняе пашырэнне гэтай дарогі яшчэ больш абвастрыла супярэчнасці. Мне давялося быць сведкам, як маладыя хлопцы станавіліся на калені перад бульдозерамі, што засыпалі крыжы аховы кожнай часткі палітай кроўю зямлі. Хлопцаў, як нейкіх злачынцаў, амапаўцы кідалі на зямлю заломвалі рукі. Мне давялося бачыць, як некаторыя рукамі абхапіўшы крыж стаялі з ім перад самасвалам, які зверху ссыпаў на іх зямельны грунт. Тут жа падбягалі міліцыянты, прымяніўшы балявы прыём, адвалаквалі ўбок чалавека. Побач стаялі гледачы. Адным з іх, які перыядычна абыякава кідаў у рот арэшкі, аказаўся слесар 5-га разраду водаканала – Анатоль. Ён па другі бок мяжы. Вінаваціць ва ўсіх грахах бэнэафүцаў: "Распальваюць варажнечу ў грамадстве". Завярае, што "апазіцыйныя СМІ хлусяць, пішуць аб збіцці абаронцаў Курапатаў". Апраўдвае пракладку другой часткі дарогі менавіта тут матэрыяльнымі выдаткамі. Другі старэнькі глядач пенсіянер-адстаўнік зазначыў: "Меня кровь расстрелянных здесь не волнует. Их растреляли по тем законам, и не нужно ворошить прошлое, винить кого-то...". Гэту мяжу абвастрае ў большасці сваёй грамадская абыякавасць, што дазваляе супрацьлегламу боку расшамархваць бюджэтныя сродкі на ўсялякія відовішчы і шкадаваць на першачарговыя патрэбы, да якой трэба аднесці і гэты невялічкі ўчастак курапацкай дарогі.

Да 1939 года мяжа дзяліла на розныя бакі вёскі Сяледчыкі (цяперашняя Вязынка) і Ліпені. З польскага боку (Сяледчыкі) можна было назіраць як на супрацьлеглым баку вяскоўцы вялі сябе неяк дзіўна і як бы пагардліва. Быццам усе анямелі, не рэагавалі на покліч, больш таго, адварочваліся і ніколі не глядзелі ў іх бок. Апрануты былі аднолькава: ватоўка, боты. З вёскі ніколі не даносілася песняў, гучных галасоў, а вечарам, як вымяралі зусім – ні агеньчыка ў вокнах. А так хацелася даведацца як жывецца пры саветах, успамінаюць зараз старажылы Вязынкі.

З другога боку жыхары савецкіх Ліпеняў былі пад пільным кантролем памежнікаў. – Ноччу, выйшаўшы па патрэбе з хаты, можна было на ганку застаць седзячага, альбо ляжачага пагранічніка, адсюль пачыналіся Курапаты. Тут быў сапраўдны ГУЛаг – успамінае Зоя Пятроўна Сай. Яна расказала, як развучвалі і спявалі песні ў склепе. Ноччу вокны павінны былі быць занавешаны. Памежнікі сачылі за кожным крокам сялян. Не дазвалялася глядзець у бок мяжы. А калі клічуць – трэба адвярнуцца і не рэагаваць. За парушэнне такіх правілаў жорстка каралі. Амаль палова сялян вёскі была арыштавана. Зніклі невядома дзе, калі моладзь збіралася пагуляць, тутачкі з'яўляўся пагранічнік і папярэджваў: "Не шутите!" Зайздросцілі другому боку мяжы. Адтуль і святло з вокнаў лілося, і гучэлі песні, асабліва на святы, на Купалле. Жыхарам Ліпеняў тлумачылі – гэта варожыя правакацыі. Помніцца, як у вёсцы збіраліся подпісы пад лістом, у якім сцвярджалася, што "жывуць яны добра, ядуць караваі".

- Нам аж да гэтай пары папракаюць старажылы Вязынкі, чаму маўчалі, калі яны клікалі пагаварыць праз мяжу, здзекліва нагадваюць пра гэтыя самыя караваі, - гаворыць Зоя Пятроўна. - А мы ж ні ў чым не вінаватыя...

Межы, межы, яны падзяляюць не толькі тэрыторыі, але і людзей на сваіх і чужых, на сумленных і несумленных. А што ж вызначае мяжу чужынства, сумлення?

Мікола Лавіцкі.

Станіслаў Суднік

Сейлавічы: крэскі на белай пляме

Спроба тапанімічна-этнаграфічнага эсэ

(Працяг. Пачатак у папярэдніх нумарах.)

У канцы 18-га – пачатку 19-га стагоддзяў прызнанне ў расейскім дваранстве напэўна атрымоўвалі розныя галіны роду Суднікаў-Грынькевічаў і ў выніку адбыўся падзел на пяць прозвішчаў. Кожная галіна роду дала Беларусі можа быць не надта відных, але аддадзеных служкаў.

Па лініі Грынкевічаў вядомы Францішак Грынкевіч (5.10.1884-26.07.1933), ксёндз, беларускі рэлігійны і культурны дзеяч. У 1909-12 г. кіраўнік Гарадзенскага гурта беларускай моладзі. Паводле А. Станкевіча "асоба Францука Грынкевіча ў Горадні была цэнтральнай і адзінай, якая будзіла там і арганізавала беларускі рух". У 1932 г. прызначаны капеланам касцёла ў Горадні. Пераклаў з лацінскай мовы на беларускую "Часіны Прачыстай Дзевы".

Грынкевіч Станіслаў Сымонавіч (2.02.1902-25.07.1945), беларускі грамадска-палітычны і культурны дзеяч, літаратар. Медык. У 1931-36 віцастаршыня ЦК Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. Друкаваўся ў беларускіх часопісах "Студэнцкая думка", "Калоссе", "Шлях моладзі", газетах "Беларуская крыніца", "Хрысціянская думка". За працу "Асвета" быў арыштаваны польскімі ўладамі. У час 2-й сусветнай вайны ўдзельнічаў у працы Віленскага беларускага нацыянальнага камітэту, супрацоўнічаў у газетах "Раніца", "Беларускі работнік", "Беларускі студэнт". У 1944 годзе арыштаваны, 18. 05. 1945 вайсковым трыбуналам Беларуска-Літоўскай вайсковай акругі прыгавораны да вышэйшай меры пакарання.

Грынкевіч Надзея Васілеўна – маці Уладзіміра Караткевіча, вялікага беларускага пісьменніка.

Уладзімір Караткевіч у рамане "Нельга забыць" і апавяданні "Паром на бурнай рацэ", якое не што іншае, як уступ да рамана, выводзіць вобраз Усяслава Грынкевіча, кіраўніка аддзелу паўстанцаў 1863 года ў Падняпроўі, аднаго са сваіх прашчураў па мацярынскай лініі.

У лістападзе 2001 года на чэмпіянаце свету па вольнай барацьбе выступаў у суперцяжкавагавой катэгорыі Барыс Грынкевіч.

Па лініі Суднікаў, як было сказана, мы маем каля васьмі вёсак. У кожнай з іх значная колькасць носіць прозвішча Суднік.

Найбольш выбітным прадстаўніком гэтай лініі з'яўляецца Міхаіл Раманавіч Суднік, беларускі мовазнавец, член-карэспандэнт АН БССР (1970). Нарадзіўся М. Р. Суднік 8 лістапада 1910 г. у в. Пяцюлёва Полацкага раёна.

Скончыў Менскі педагагічны інстытут у 1936 г. У 1943-44 г. начальнік упраўлення кадраў наркамасветы БССР. У 1944-52 гг. навуковы супрацоўнік, вучоны сакратар Інстытута мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР, у 1954 г. кандыдат філалагічных навук. у 1952-1957 гадах загадчык сектару навуковай тэрміналогіі і сектару слоўнікаў, у 1957-83 г.г. дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа АН БССР і адначасова загадчык сектару лексікалогіі і лексікаграфіі. Аўтар шматлікіх кніг, слоўнікаў і даследванняў.

Жонка Міхаіла Раманавіча цётка Яня родам з Язвінаў Капыльскага раёна, што кіламетраў за 10 ад Сейлавіч. На жаль мне не давялося сустрэцца з Міхаілам Раманавічам асабіста. Усё знаёмства абмяжавалася некалькімі размовамі па тэлефону з ім, а больш з цёткай Яняй.



Міхаіл Раманавіч Суднік

Сярод лінгвістаў ёсць Тамара Суднік – даследчык дыялектаў літоўска- славянскага памежжа. Аўтар і сааўтар шматлікіх працаў, супрацоўнік інстытута славяназнаўства і балканістыкі колішняй АН СССР.

У Магілёве Генадзь Суднік – рэдактар газеты "Тыднёвік Магілёўскі", былы кіраўнік магілёўскай абласной тэле-радыё кампаніі.

Быў вядомы лёгкаатлет, здаецца Іван, Суднік, які прыстойна выступіў на чэмпіянаце свету ў Італіі

Шмат іншых годных людзей. Нажаль ніхто не займаўся радаводам гэтага клану. І як аказалася, вось так сходу гэтай задачы не адолець. А калі б усе Суднікі, Грынкевічы, Суднікі-Грынкевічы, Грынкевічы-Суднікі ды Суднікoвічы, якія зараз жывуць на Беларусі і за межамі, склалі разам свае біяграфіі ды ўспаміны, то атрымалася б паралельная гісторыя Беларусі.

Мая маці ўроджаная Ганна Адамаўна Некраш-Лапатэцкая. У Сейлавічах былі чатыры сям'і Некрашаў-Лапатэцкіх, якія зараз пішуцца проста Некрашы.

Пра дзеда Адася Некраша распавядалася раней. Яшчэ да ўсталявання польска-савецкай мяжы Адась Некраш жаніўся на Стэфаніде (Стэфаніі, Стэфцы) Войніч з Масявіч. Пасля ўсталявання мяжы Масявічы аказаліся на савецкім баку. З гэтага ж роду паходзіць славуты ковенскі аптэкар Войніч, муж Этэль Лідыян Войніч, прататып Артура ў рамане "Шэршань".

Засценак Масявічы, адкуль паходзілі Войнічы быў спалена разам з людзьмі ў час вайны, больш не аднавіўся. Адносілася ці то да Капыльскага, ці Стаўбцоўскага раёнаў.


Адна сям'я Войнічаў жыла і ў Сейлавічах. Іосіф Войніч загінуў на вайне. За маёй бытнасцю такога прозвішча ў Сейлавічах больш не было.

Так у ваколіцах Сейлавіч гэты род знік, але на Беларусі прадстаўлены даволі шырока.

У гістарыяграфіі вядомыя два адгалінаванні гэтага роду.

Войнічы гербу "Стрэмя"

Вядомыя – Аляксандр, уладальнік фальварка Ярушоўскі-Ялухоўскі з маёнткам Ваўканоша ў Навагрудскім пав., які набыў ад Пятра і Соф'і, дачкі Юзафа Руцкага, ды Юрыя і Рэгіны, дачкі Пятра Цэдроўскага,



Герб "Стрэмя"

Крыштафовічаў-Ваўканоўскіх (1620). Яго сын Марцін ад шлюбу з Аленай Каспяровіч меў сыноў Станіслава і Яна. Сыны апошняга Аляксандр (беспатом.) і Станіслаў атрымалі ад дзядзькі Станіслава Марцінавіча і Марыянны з Шушынскіх В. у валоданне фальв. Ярушоўскі-Ялухоўскі. Станіслаў Янавіч пакінуў сына Тамаша, спадчынніка маёнт. Ваўканоша.

Прызнаны ў дваранстве 26.05.1800.


Войнічы гербу "Харытонавіч"

Вядомыя – Андрэй, ад жонкі з роду Бандароўічаў меў сына Яна (нар. У 1735). Сыны апошняга Ваўжынец (нар. У 1761) і Ігнацы (нар. У 1767), доктар філасофіі навук вольных. Апошні меў сыноў Леанарда, Людвіка і Ігнацыя.

Яны ў якасці доказу на шляхецтва прад'явілі сведчанне ўрадніка і абывацеляў Навагрудскага пав. за 1798.

Прызнаны ў дваранстве 9(20).12.1798 г.

Да якога гербу належалі сейлавіцкія і масявіцкія



Герб "Харытонавіч"

Войнічы сказаць пакуль не магу, магчыма і да розных.

Дарэчы, пра раман Э. Войніч, назву яго расейцы перакладаюць, як "Овод". Некаторыя беларусы спрабуюць перакладаць гэтае слова, як "Авадзень", што абсалютна не правільна. Беларусы адрозніваюць *аваднёў* і *сляпнёў*. Але расейскі *овод* нічога агульнага не мае з аваднём ці слепнем, як і *ворон* з варонай. Расейскаму *овод* адпавядае беларускае *шэршань*. Гэтае насякомае разоў у пяць-дзесяць большае за авадня.. У Сейлавічах яго называюць яшчэ *здрок*. Калі гэты здрок уджаліць карову, то яе нельга супыніць паўдня. Расказвалі пра смяротны выпадак, калі здрок уджаліў дзіця ў голаву.

Мне давялося быць сведкам таго, што робіцца з канём, калі яго ўджаліць шэршань.

Аднойчы я гроб сена на *грабілцы (конныя граблі)*. Заставалася дагрэбці нямшат і, пакуль даграбаў, прыпазніўся на абед. Прыехаў на канюшню, а там нікога няма, усё зачынена. У такіх выпадках звычайна на кані ехалі пад дом, але цяляпацца з грабілкаю па вёсцы, заняўшы ўсю вуліцу не хацелася. Не распрагаючы і не прывязваючы каня я адышоўся паглядзець, мо якія дзверы не замкнёныя і можна каня завесці. У гэты час здрок і ўпёк каня. Конь як скочыць, як паляціць, а канюшня вакол агароджана, адна толькі брамка каля студні была адчынена. Конь як урэзаў у гэтую брамку, выскачыў з аднымі аглоблямі. Шулы былі дубовыя, то ўстаялі, а ад грабілкі засталася куча металалому. Божачкі, што рабіць? А конь адбегся і стаіць з аглоблямі. Узяў я каня, зачапіў грабілку, зацягнуў пад кузню. Там жа кінуў і аглоблі. Каня прывязаў да дзвярэй канюшні. На тым і ўсё.

Тры дні не ішоў на працу. Балазе, калгас. Ніхто той грабілкі не дапамінаўся. Так і абышлося. Бо каб даведаліся, то хоць і не вінаваты, а гвалту было б.

Родны брат Адася Некраша Віктусь Некраш быў жанаты на Юзэфе Сянкевіч з Мікалаеўшчыны, блізкай сваячцы Якуба Коласа. Адна з бабак Якуба Коласа была ўраджонае Сянкевіч. Юзэфа Міхайлаўна Сянкевіч была 1901 года нараджэння. Калісьці яна апавядала, што з бацькамі часцяком хадзілі ў госці да Міцкевічаў або, як казала "да Коласаў". Юзэфа Некраш (Сянкевіч) атрымоўваецца паводле разлікаў траюраднай сястрой Коласу. Як мне падавалася, гэта можна ўстанавіць дакладна, але нават найдасведчанейшыя біёграфы Коласа, калі справа даходзіць да бабак песняра, губляюцца. Што ўжо казаць пра іншых пісьменнікаў і дзеячоў Беларусі.

(Працяг у наст. нумары.)



Сёстры Грынкевіч: Яўгенія Васілеўна, Надзея Васілеўна (маці Уладзіміра Караткевіча) і Ганна Сцяпанаўна, 1913 г.



Помнік на магіле Віктуся і Юзэфы Некраш (траюраднай сястры Якуба Коласа) на Сейлавіцкіх каталіцкіх могілках

Павел Музычкін

ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

Максім Багдановіч – любімы паэт беларусаў, амаль усё сваё нядоўгае жыццё ён пражыў удалечыні ад Бацькаўшчыны і памёр на чужыне. Пры жыцці паэта выйшаў адзін зборнік вершаў "Вянок".

Постаць Максіма Багдановіча надзвычай прыцягальная, у ёй шмат загадкавага. "Госцем з высокага неба" назваў Багдановіча Аркадзь Смоліч – палітычны і культурны дзеяч, вучоны-географ, аўтар "Геаграфіі Беларусі".

У 1981 годзе была прынята пастанова аб стварэнні музея Максіма Багдановіча ў Менску. Музей адчыніўся ў 1991 годзе, да 100-х угодкаў з дня нараджэння паэта. Ён знаходзіцца ў двухпавярховым прыгожым мураваным будынку ў Траецкім прадмесці. Гэта старажытны куток на левым беразе Свіслачы. З матэрыялаў раскопак вядома, што культурнае жыццё тут існавала з канца XII стагоддзя. На Траецкай гары ў XIV ст. існавалі Узнясенскі кляштар і царква, у XVII ст. – цэлыя кварталы забудоў.

Галоўнай вуліцай прадмесця была Траецкая, у XIX ст. перайменаваная ў Аляксандраўскую (цяпер вуліца Максіма Багдановіча). На гэтай вуліцы, у доме Карказовіча, у канцы XIX ст. месцілася І-я Менская прыходская вучэльня, у якой працаваў настаўнікам бацька паэта – Адам Багдановіч. Першы паверх дома з вучэльняй быў мураваны. Настаўніцкая кватэра Адама Багдановіча была на другім, драўляным, паверсе. Тут і нарадзіўся 27 лістапада 1891 г. будучы паэт Беларусі.

Літаратурны музей Максіма Багдановіча знаходзіцца непадалёк ад таго месца, дзе нарадзіўся паэт. З вялікай спадчыны Максіма Багдановіча ўласна мемарыяльных прадметаў засталося няшмат: чатыры асобнікі зборніка "Вянок", арыгінальная здымкі, рукапісны зборнік вершаў "Зелення", некалькі аўтографаў. Гэта каштоўныя здабыткі музея. Вялікі архіў паэта страчаны падчас Другой сусветнай вайны. Верагодна, што ён апынуўся за мяжой. Зборы музея – гэта здымкі, дакументы, рукапісы, кнігі, рэчы, якія належалі сваякам і знаёмым Максіма Багдановіча, яго сябрам, экспанаты, перададзеныя іх нашчадкамі.



Ладная частка экспанатаў сабраная дзякуючы руплівым пошукам і ахвярнай даследчыцкай працы бібліёграфа Ніны Барысаўны Ватацы. Музейныя калекцыі дапаўняюць тыпалагічныя прадметы часу, матэрыялы па багдановічазнаўстве і ўшанаванні памяці паэта.

Даследчык Іван Замоцін назваў паэзію Багдановіча "асяроддзем зачараваных люстраў". Паспрабуем зазірнуць у свет паэта, прачытаць ягоны "Вянок" – кнігу адзінства паэзіі і лёсу – праз вакно экспазіцыі, праз пяць невялікіх залаў.

Нешырокая лесвіца з каванымі металёвымі парэнчамі, упрыгожанымі раслінным арнаментам, вядзе на другі паверх. На вокнах уздоўж лесвіцы вітражы з сілуэтамі старога Менска. У цэнтры столі, зіхацяць у промнях зыркага святла вялікая жырандоля ў выглядзе пераплецeных вянкоў, струменяў і кропель дажджу.

Знаёмства з залай, якая мае назву "Дзяцінства паэта. Вытокі таленту. Цыклы "Згукі Бацькаўшчыны" і "У зачараваным царстве", пачынаецца з маленства на Беларусі. Экспазіцыю адкрывае мастацкая работа Пятра Драгова "Менск 1891 года", якая ўяўляе сабой рэканструкцыю старажытнага цэнтра Менска – Верхняга горада. Выгляд з Траецкай гары непадалёк ад месца нараджэння Максіма Багдановіча. Над панарамай – герб Менска – які быў нададзены гораду ў 1591 годзе – выява Маці Божай а вакол яе два анёлы, што малельна склалі свае рукі.

Даволі лёгка пазнаём Дамініканскі касцёл (XVII ст.), касцёлы Бернадзінцаў і Бернадзінак (XVII ст.), кафедральны (езуіцкі, фарны) касцёл, Святадухаўскую (уніяцкую) царкву (XVII), якая была перабудаваная ў XIX ст. і перайменаваная ў 1799 г. у Петрапаўлаўскі сабор. У гэтым саборы хрысцілі Вадзіма Багдановіча – старэйшага брата паэта, Ганну Гапановіч – стрыечную сястру і, верагодна, самога Максіма Багдановіча.

Бацька паэта – знакаміты этнограф і краязнаўца Адам Ягоравіч Багдановіч – нарадзіўся ў простай прыгоннай сям'і, здолеў вывучыцца і скончыць Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, а ў 1886 годзе атрымаў працу настаўніка ў І-й Менскай прыходскай вучэльні, аб чым сведчыць на стэндзе грамата ад 15 кастрычніка таго года ад кіраўніцтва Віленскай навучальнай акругі да маладога настаўніка. Маці – Марыя Апанасаўна Мякота – паходзіла з роду праваслаўных святароў, валодала музычнымі і лінгвістычнымі здольнасцямі, была таленавітым пісьменнікам, хоць і напісала ўсяго адно апавяданне. Вось як аб гэтым гаварыў яе муж: "Адно апавяданне, ёю напісанае, сведчыць, што яна валодала здольнасцю выяўленчасці, і пры гэтай умове з яе магла выпрацавацца добрая пісьменніца". Марыя вучылася спачатку ў Менскай Аляксандраўскай вучэльні, а пасля ў Пецярбурзе у земскай настаўніцкай школе. У экспазіцыі маецца з тых часоў "Свидетельство о поступлении в число слушателей Санкт-Петербургской Земской Учительской школы дочери дворянина М. А. Мякота" (рускі варыянт) за подпісам пецярбургскага граданачальніка. у 1893 г. у газеце "Гродненские губернские ведомости" было надрукавана яе, як мы ўжо казалі, адзінае апавяданне "Накануне Рождества".

19 (6) сакавіка 1890 года ў сям'і Багдановічаў нарадзіўся сын Вадзім, а 9 снежня (27 лістапада ст. ст.) – Максім. З жыцця ў Менску захаваліся літаральна адзінкі мемарыяльных рэчаў. Да іх належаць кавярнік бацькоў Максіма, якія былі аматарамі кавы. Таксама попельніца, партманэт (гамэтка), кій Адама Багдановіча. Некалькі самых старажытных сямейных фотаздымкаў, - бабулі і дзеда паэта, маці, бацькі. Летам 1892 года сям'я Багдановічаў пераехала ў Гародню, дзе Адам Ягоравіч атрымаў працу ў Сялянскім пазямельным банку.

Першая катастрофа ў сям'і – у кастрычніку 1896 года ў 27- гадовым узросце ад сухотаў памірае маці. Апошні здымак Марыі Апанасаўны з кароткай стрыжкай, пасведчанне аб смерці, выдадзенае Гарадзенскім Сафійскім саборам, - памяткі сямейнай трагедыі. Са стратай маці страціў маленькі Максім і Радзіму: у лістападзе1896 года сям'я пераехала ў Ніжні Ноўгарад.

Дамінанта І-й залы – стэнд з матэрыяламі беларускіх фалькларыстаў (Я. Чачота, Е. Раманава, П. Шэйна), якія перадаюць настрой першых цыклаў "Вянка". У цэнтры стэнда кніга – этнаграфічны нарыс Адама Багдановіча "Пережитки древнего миросозерцания у белоруссов" (Гародня, 1895 год). Гэта адна з настольных кніг Максіма, яна адкрывала паэту таямнічы і багаты свет уяўленняў і сузіранняў беларусаў – гэтая зусім невялічкая кніга – "унікум", яе ў 1913 годзе прышле "ў прэзент" Максім сакратару "Нашай Нівы" В. Ластоўскаму. Кніга бацькі ў комплексе з вышываным Марыяй Мякотай ручніком змешчана ў густоўна аздобленай скураной рамцы. Гэта экспанаты – сімвалы. Мастацкае афармленне залы: гіпсавая лепка на столі часткова паўтарае арнамент ручніка; вырабы з саломкі нагадваюць Змяінага Цара, русалчыны косы, лясныя, балотныя і палявыя кветкі. Ручнік маці сімвалізуе памяць аб Бацькаўшчыне, шляхі Беларусі. Над ім змешчаныя два здымкі Максіма: арыгінал – Максім з братамі і цёткай Марыяй (фота зроблена ў хуткім часе пасля прыезду ў Ніжні Ноўгарад); муляжвыкадроўка ў круглай рамцы ў павялічаным выглядзе. У Ніжнім бацька Максіма стварае для сыноў вялікую бібліятэку, дзе знаходзіліся ўсе самыя лепшыя і значныя літаратурныя творы сусвету і якія старана чыталі і вывучалі Максім з братам. На жаль, бібліятэка згарэла ў ліпені 1918 года падчас белагвардзейскага мяцяжу ў Яраслаўлі. Невялікую частку тое бібліятэкі збераглі і перадалі ў музей нашчадкі. Сярод выданняў, экспанаваных у музеі, "Калева" (фінскі народны эпас), "Юнацкія песні сербскага народу", кнігі М. Лермантава, Гётэ – мемарыяльныя.

Вядома, што Адам Багдановіч быў у сваяцкіх і сяброўскіх адносінах з сям'ёй Пешкавых, з самім Максімам Горкім. Памерлы ў 4-хгадовым узросце сын Адама і яго жонкі Аляксандры Волжынай, таксама памерлай, - яна была сястрой жонкі "Буревестника революции" – выхоўваўся якраз у Пешкавых. У гэты перыяд, асабліва ў часы І-й рускай рэвалюцыі, браты захапляліся, як звычайна ў той час моладзь, таксама рэвалюцыйнымі ідэямі – Максім анархізмам, а Вадзім – народніцтвам. Пры гэтым яны зусім не сварыліся, наадварот – паважна адносіліся адзін да аднаго. Таму смерць брата ў 1908 г. ва ўзросце 18 гадоў ад сухотаў была моцным ударам па Максіму. Хавалі яго ноччу, бо паліцыя страшылася народных хваляванняў – гэта мы ведаем са слоў Паўла Багдановіча.

Першая дарадца паэта – Вольга Епіфанаўна Сёмава – працавала загадчыцай жаночай гімназіі спачатку ў Менску, потым – у Пінску, выкладала нямецкую і французскую мовы. Менавіта яна выпісала для Максіма "Нашу долю", а пасля "Нашу Ніву", што добра адлюстравана ў апошнім стэндзе І-й залы: нумары "Нашай долі", а таксама № 2, 3, 4, 6, 23 "Нашай нівы" ("Nasza Niwa"). Цэнтрам увагі Максіма Багдановіча было нацыянальна-культурнае адраджэнне Беларусі і яе маладая літаратура.

Другая зала мае выразную назву – "Станаўленне творчай індывідуальнасці". Нізка вершаў "Старая Беларусь" і "Места". Яна адлюстроўвае літаратурны дэбют у "Нашай Ніве", паездкі паэта ў Вільню і Ракуцёўшчыну летам 1911 года, тэму нацыянальнага адраджэння ў спадчыне паэта. Кампазіцыйным ядром залы з'яўляецца своеасаблівы іканастас, або капліца – графічны рад з 12 постацяў рэлігійных і культурных дзеячоў старажытнай Беларусі. Другі – фатаграфічныя выявы беларускіх дзеячоў культуры і літаратуры XIX – пачатку XX стагоддзяў разам з творамі (сярод іх Якуб Колас і яго раман "У палескай глушы", Янка Купала, "Гусляр", Кастусь Каліноўскі з № 3, 6, 7 "Мужыцкай праўды", Францішак Багушэвіч і "Жалейка", Цішка Гартны і ягоныя "Песні" і інш.) Экспанаты-сімвалы – слуцкі пояс і Статут ВКЛ (рэдакцыя 1588 года).

У 1907 годзе ў газеце "Наша Ніва" (№24) з'явіўся першы друкаваны твор Максіма Багдановіча "Музыка", які і стаў своеасаблівым творчым маніфестам паэта. У хуткім часе былі надрукаваны творы "Прыйдзе вясна", "Ноч", "На чужыне", "Над магілай". "Старонка лепшая ў штодзённіку жыцця" – так назваў паэт гэты час. Ракуцёўскі творчы "даробак" – гэта два цыклы вершаў "Старая Беларусь" і "Места", а таксама дзве паэмы "Вераніка" і "У вёсцы" (нізка "Мадонны").

(Заканчэнне ў наст. нумары.)

Рэдактар Станіслаў Суднік

Заснавальнік: ТБМ імя Францішка Скарыны.
Пасведчанне аб рэгістрацыі: № 83 ад 28 чэрвеня 1996 г.
Адрас рэдакцыі: 220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13.
Адрас для паштовых адпраўленняў: 231300, г. Ліда-2, п/с 7.
E-mail: ns@lida1.lingvo.grodno.by
http://tbm.org.by/ns/

Рэдакцыйная калегія:
Вадзім Болбас, Міхась Булавацкі, Людміла Дзіцэвіч, Леакадзія Мілаш, Язэп Палубятка, Алесь Петрашкевіч, Людміла Піскун, Уладзімір Содаль, Станіслаў Суднік, Павел Сцяцко, Алег Трусаў.

Аўтары цалкам адказныя за падбор і дакладнасць прыведзеных інфармацый

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні.
231300, г.Ліда, вул. Ленінская, 23.
Газета падпісана да друку 3. 12. 2001 г.
Наклад 3800 асобнікаў. Замова № 2693.
Падпісны індэкс: 63865.
Кошт падпіскі: 1 мес.- 418 руб., 3 мес.- 1254 руб.
Кошт у розніцу: 100 руб.